АСПЕКТ ПРАБЛЕМЫ
СІТУАЦЫЯ НА РЫНКУ ПРАЦЫ 2 стар.
ПАЎПРЭДЫ БЕЛАРУСІ
АРГЕНЦІНА СТАНОВІЦЦА БЛІЖЭЙ 2–3 стар.
ДАБРАЧЫННАСЦЬ
Хорст ПФІСТЭР — АНЁЛ ДЛЯ ХВОРЫХ ДЗЕЯЦЕЙ 3 стар.

СІТУАЦЫЯ
АЎТАРСТВА ВЯДОМАГА АНАНІМНАГА ТВОРА — ПАЭМЫ "СКАЗ ПРА ЛЫСУЮ ГАРУ" — АСПРЭЧВАЮЦЬ ДВА ПАЭТЫ 4 стар.
КАНТАКТЫ І ДЫЯЛОГІ 5–6 стар.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ. ЗША
"ГР" РОБІЦЬ ДОБРУЮ СПРАВУ 7 стар.
ФЕСТЫВАЛІ
"БЕЛАЯ ВЕЖА" НАЗВАЛА ЛАЎРЭАТАЎ 8 стар.
ВЫСТАВЫ
ДЗЕЦІ МАЛЮЮЦЬ ГІСТОРЫЮ 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі
Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

2 кастрычніка 2003 года, № 40 (2858) Цана 170 рублёў E-mail:golas_radzimy@tut.by

беларусь – расія

У Маскве прайшлі Дні Рэспублікі Беларусь. Мерапрыемства такога размаху наша краіна праводзіла ў расійскай сталіцы ўпершыню за апошнія дзесяцігоддзі. У Днях Беларусі ў Маскве прынялі ўдзел каля 6 тысяч чалавек: дзяржаўныя дзеячы, губернатары, кіраўнікі прадпрыемстваў, бізнесмены, банкіры, работнікі сферы абслугоўвання, спартсмены, работнікі культуры, журналісты. Усяго ў рамках гэтай акцыі ў расійскай сталіцы адбылося каля 500 мерапрыемстваў. Сустрэча членаў афіцыйнай беларускай дэлегацыі з прадстаўнікамі 100-тысячнага маскоўскага зямляцтва беларусаў прайшла ў тэатры "Эрмітаж". У сустрэчы прыняў ўдзел Станіслаў Буко, старшыня Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Станіслаў БУКО: БЕЛАРУСКАЕ СВЯТА Ў МАСКВЕ АТРЫМАЛАСЯ

Вечар-сустрэчу адкрыў пасол Беларусі ў Расіі Уладзімір Грыгор'еў. Затым да суайчыннікаў звярнуўся намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль Цюцюноў. Ён перадаў прывітанне Прэзідэнта Беларусі суайчыннікам, якія пражываюць у расійскай сталіцы. А.Цюцюноў падкрэсліў асаблівую значнасць беларускай дыяспары ў працэсе саюзнага будаўніцтва.

— Зала тэатра была поўная, — расказвае Станіслаў Буко. — Настрой землякоў быў прыўзняты. Многія з іх ужо наведалі першыя мерапрыемствы Дзён Беларусі ў Маскве і адчулі гонар за сваю Радзіму. Адзначаючы ролю беларусаў Расіі і Масквы ў развіцці беларуска-расійскага супрацоўніцтва, я ўручыў Ганаровыя граматы камітэта і ілюстраваныя кнігі "Беларусь мая — песня мая" кіраўнікам федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы — Расіі» — Францішку Каўрыгу і рэгіянальнай арганізацыі "Беларусы Масквы" — Мікалаю Шлягу.

Прыемным сюрпрызам для ўсіх стала выступленне "Місіс-Расія" Анжалікі Агурбаш, нашай суайчынніцы, якая па просьбе землякоў выканала песню пра Ефрасінню Полацкую.

Да афіцыйных асоб ад прысутных было шмат пытанняў, у большасці пра лёс беларуска-расійскай інтэграцыі. Пасол Рэспублікі Беларусь Уладзімір Грыгор'еў грунтоўна адказваў, акцэнтуючы ўвагу на тым, што мэтанакіраваная работа вядзецца так, каб пазбегнуць памылак і ўлічыць усе інтарэсы бакоў.

Згадваўся яскравы факт, які характарызуе ўзровень развіцця адносін паміж Беларуссю і Масквой: тавараабарот паміж нашай краінай і расійскай сталіцай у два разы перавышае аб'ём усяго гандлю Расійскай Федэрацыі з ЗША.

Сустрэча з беларускай дыяспарай Масквы закончылася праглядам спектакля Брэсцкага абласнога тэатра драмы і музыкі "Саламея Русецкая" на беларускай мове.

Віктар МАЦЮШЭНКА.

НА ЗДЫМКАХ: старшыня Савета федэрацыі НКА «Беларусы Расіі» Францішак Каўрыга і намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль ЦЮЦЮНОЎ; прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Маскве; спявае Анжаліка АГУРБАШ.

Фота **БелТА.**

асоба

НЕПЕРАЎЗЫДЗЕНАЯ ПАЎЛІНА МЯДЗЁЛКА

Яна дала сцэнічнае жыццё неўміручай Паўлінцы Янкі Купалы

У музеі Янкі Купалы адбылася вечарына, прысвечаная 110-годдзю з дня нараджэння Паўліны Мядзёлкі, першай выканаўцы ролі Паўлінкі ў аднайменнай п'есе беларускага класіка.

Вечарыну адкрыў дырэктар музея Сяргей Вечар. Затым выступілі прадстаўнік Міністэрства культуры Тадэвуш Стружэцкі, дырэктар Дзяржаўнага музея-архіва Ганна Запартыка, паэт-даследчык беларускай культуры Сяргей Панізнік, які асабіста ведаў Паўліну Мядзёлку.

З вялікай цікавасцю перапоўненая зала музея слухала родзічаў Паўліны: Лідзію Ламнёву, Алісу Плісанаву. А Андрэй Плісанаў яшчэ выканаў свае песні, напісаныя пры жыцці Мядзёлкі. Дарэчы, ён таленавіты і незвычайны чалавек: паэт, бард, мастак, кінарэжысёр, калекцыянер сучаснага беларускага жывапісу. У яго калекцыі больш як 3 000 палотнаў.

Гучалі вершы Янкі Купалы (па меркаванні некаторых, прысвечаныя Мядзёлцы), з якімі выступіла народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч.

Ведала асабіста Паўліну актрыса тэатра імя Янкі Купалы Галіна Бальчэўская, яна яе выхаванка і нарадзілася ў тым жа горадзе Будславе. Г.Бальчэўская расказала пра актрысу шмат цікавага і невядомага.

Выступіла Ала Долгая, яна сямнаццаць гадоў выконвала ролю Паўлінкі ў несмяротным спектаклі. А ён ужо шэсцьдзесят гадоў не сыходзіць са сцэны. Затым выступілі і паказалі ўрывак са спектакля цяперашнія выканаўцы Купалаўскага тэатра Юлія Шпілеўская (Паўлінка), Алег Гарбуз (Адольф Быкоўскі).

Вечарына праходзіла сярод экспанатаў выставы з фондаў музея і асабістага архіва Сяргея Панізніка, прысвечаных слыннай асобе.

НА ЗДЫМКУ: Паўліна МЯДЗЁЛКА. 60-я гады. Будслаў.

Мікола ЛАВІЦКІ.

Здымак з фондаў Дзяржмузея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі.

хроніка жыцця

УДЗЕЛ БЕЛАРУСІ Ў РАБОЦЕ 58-Й СЕСІІ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АСАМБЛЕІ ААН

Урадавая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале з міністрам замежных спраў Сяргеем Мартынавым прыняла ўдзел у рабоце 58-й сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

С.Мартынаў выступіў перад удзельнікамі форуму, выказаўшы пазіцыі Беларусі па пытаннях замацавання ролі ААН у новых глабальных геапалітычных рэаліях, а таксама месцы Руху недалучэння ў сусветных працэсах.

"ЗАЛАТЫЯ" "КОНТУРЫ" АЛЯКСАНДРА АВЕРКАВА

Вядучы праграмы "Контуры" Другога Нацыянальнага тэлеканала Беларусі (АНТ) Аляксандр Аверкаў удастоены дыплома і прыза "За майстэрства вядзення інфармацыйнай праграмы" на IV Міжнародным тэлекінафоруме "Разам", які прайшоў у Ялце.

У гэтым творчым спаборніцтве прынялі ўдзел 35 краін свету. Конкурс праводзіўся па 10 намінацыях, у адной з іх — "Інфармацыйна-аналітычныя праграмы" — прадстаўлены канал АНТ. Сярод стваральнікаў форуму — Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія "Мир", Саюз журналістаў Расіі, Дзяржкамінфарм і Нацыянальная асацыяцыя работнікаў СМІ Украіны, Міжнародная акадэмія тэлебачання і радыё, міжнародныя канфедэрацыі — саюзаў журналісцкіх і кінематаграфістаў.

Яшчэ адзін поспех АНТ: галоўны прыз — "Чарнаморская чайка" — атрымаў праект "Беларусы ў Афрыцы. Ралі па Сахары" з Ксеняй Волкавай на прайшоўшым у Адэсе V Міжнародным фестывалі тэлепраграм "Украіна адзіная". На конкурс было прадстаўлена 305 работ 118 тэлекампаній з Расіі, Украіны, Малдовы, Казахстана, Грэцыі, ЗША, Ізраіля, Германіі. Беларусы сталі лаўрэатамі ў намінацыі "Ад мора да мора".

"ФОКЕРЫ" ПРЫЗЯМЛЯЮЦЦА Ў МІНСКУ

Нямецкая авіякампанія "Дойчланд" адкрыла для сябе Мінскі авіярамонтны завод.

Буйны заходнееўрапейскі авіяперавозчык збіраецца заключыць з беларусамі доўгатэрміновы кантракт на рамонт самалётаў "Фокер-100". Па папярэдніх ацэнках, размова можа ісці пра сто машын такога тыпу. Раней такія лятальныя апараты аднаўлялі ў Нідэрландах. Прадстаўнікі кампаніі "Дойчланд" ужо пабывалі ў Дзяржкамітэце авіяцыі Рэспубліцкі Беларусь, азнаёміліся з вытворчай базай сталічнага прадпрыемства.

УНІКАЛЬНАЯ АПЕРАЦЫЯ

У НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава адначасова былі выкананы тры аперацыі на лёгкім, сэрцы і брушной аорце.

Сусветная медыцынская практыка не ведае прэцэдэнтаў паспяховай сінхроннай хірургічнай карэкцыі трох смяротна небяспечных захворванняў: рака лёгкага, хранічнай каранарнай недастатковасці і анеўрызмы брушнога аддзела аорты.

Аперацыю праводзілі тры брыгады хірургаў на працягу сямі гадзін. 68-гадовы пацыент быў выпісаны на трынаццатыя суткі ў здавальняючым стане.

Падрыхтавала **Таццяна КУВАРЫНА.**

*NEWS FROM BELARUS * БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ * BIALORUSKIE WIADOMOŚCI * NOTICIAS DE BELARUS * БІЛОРУСЬКІ НОВІНІ *

з прэс-канферэнцыі

МЫТНЯ СУСТРАКАЕ І ПРАВОДЗІЦЬ...

Старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Аляксандр Шпілеўскі сустрэўся з прадстаўнікамі СМІ, каб расказаць пра справы гэтай службы.

Таможня ва ўсе часы была адной з неабходных структур дзяржавы. Праз Беларусь, якая знаходзіцца ў самым цэнтры Еўропы, здаўна праходзяць транспартныя магістралі, па якіх перамяшчаюцца асноўныя патокі пасажыраў і грузаў з Захаду на Усход і наадварот.

На сённяшні дзень на граніцах нашай краіны працуе 13 таможняў, якія выконваюць свае функцыі ў 194 пунктах таможнага афармлення. Апошнія гады суправаджаліся значнымі змяненнямі асноўных задач і функцый таможнай сістэмы, мэта якіх — набліжэнне да сусветных стандартаў. Цяпер таможня мае статус праваахоўнага органа і стала суб'ектам аператыўна-вышуковай дзейнасці.

Дзяржаўны таможны камітэт вядзе барацьбу з транзітам наркотыкаў, алкагольных напіткаў, цыгарэт, бытавой электроннай тэхнікі, гандлем крадзенымі аўтамабілямі, незаконным увозам валюты, твораў мастацтва і гістарычных каштоўнасцей. Толькі з пачатку 2003 года папярэджана 11 000 злачынстваў і правапарушэнняў. Кошт канфіскаваных за гэты час тавараў і транспартных сродкаў склаў 16 мільярдаў 400 мільёнаў рублёў.

На пачатак верасня бягучага года ў дзяржаўную казну паступіла 1 трыльён 281 мільярд 800 мільёнаў рублёў.

Вялікае значэнне для выяўлення парушэнняў, а таксама скарачэння часу праходжання таможных працэдур мае інфраструктура. У адпаведнасці з Саюзнай праграмай завершана будаўніцтва міжнародных аўтадарожных пунктаў пропуску "Каменны Лог" (беларуска-літоўскі ўчастак граніцы), "Новая Гута" (беларуска-ўкраінскі ўчастак), "Казловічы" (беларуска-польскі ўчастак), планіровачныя рашэнні і аснашчанасць якіх адпавядаюць еўрапейскаму ўзроўню, завяршаецца рэканструкцыя пункта пропуску "Варшаўскі мост" (беларуска-польскі ўчастак). Дзяржаўны таможны камітэт актыўна ўзаемадзейнічае з іншымі дзяржаўнымі структурамі, органамі кіравання, МУС і іншымі. Прымаюцца розныя меры нарматыўна-прававога і арганізацыйнага характару. Праблемы вырашаюцца за кошт спрошчвання таможных працэдур і уніфікацыі таможнага заканадаўства з Расіяй, дзяржавамі СНД і ў рамках Таможнага саюза Беларусі, Расіі, Казахстана, Кіргізіі, Таджыкістана, гэтаму ж садзейнічае ўдзел у рабоце Сусветнай таможнай арганізацыі.

Свет змяняецца, і таможная служба Беларусі не павінна адставаць. Таможнікі абараняюць інтарэсы дзяржавы і грамадства, садзейнічаюць эканамічнаму развіццю краіны.

Мсціслаў ІГНАЦЕНКА.

НА ЗДЫМКАХ: рэканструкцыя пагранічнага перахода "Варшаўскі мост" набліжаецца да свайго завяршэння. Зроблены навесы, аглядныя каналы, заканчваецца рамонт дарожнага пакрыцця і аддзелачныя работы ў галоўным корпусе таможні і ў памяшканнях прыгранічнага гандлю, сервісу. Цяпер турысты змогуць аформіць дакументы, неабходныя для перасячэння мяжы, у камфортных умовах. Гэтаму надаецца немалаважнае значэнне, бо Брэст з'яўляецца не толькі тварам і "заходнімі варотамі" Рэспублікі Беларусь, але і СНД.

Фота **БелТА.**

аспект праблемы

СІТУАЦЫЯ НА РЫНКУ ПРАЦЫ

У грамадскім прэс-цэнтры адбыўся "круглы стол", прысвечаны праблемам занятасці насельніцтва.

Мікалай Коханаў, дырэктар дэпартамента па занятасці насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, зазначыў, што сітуацыя на рынку працы знаходзіцца пад кантролем і ёю можна кіраваць. Колькасць беспрацоўных у Беларусі вельмі адрозніваецца па рэгіёнах. Ёсць мясціны (у асноўным у правінцыі), дзе, па словах М.Коханава, на адно працоўнае месца прэтэндуюць 20 чалавек. Але ў цэлым па краіне колькасць тых, хто шукае працу, складае 3, 8 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва. У сталіцы ж гэтая лічба і таго меншая — 1,7 працэнта, што з'яўляецца самым нізкім паказальнікам па Беларусі. І колькасць беспрацоўных змяншаецца. Так, у студзені такіх было 16 400 чалавек, а ў жніўні — 15 699.

У беспрацоўя па-ранейшаму жаночы твар. **Соф'я Свярдлова**, намеснік дырэктара Мінскага гарадскога цэнтра занятасці, падкрэсліла, што ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года адбылося пагаршэнне кан'юнктуры рынку для жанчын. Сярэдні ўзрост людзей, што згубілі працу, 31,1 года. За апошні час кваліфікацыйна-адукацыйны ўзровень беспрацоўных павысіўся. Але больш паловы з іх маюць сярэднюю ці няпоўную сярэднюю адукацыю. Па словах М. Коханава, асаблівую занепакоенасць выклікае працаўладкаванне непаўналетніх, якія не прываблліваюць работадаўцаў, бо маюць шэраг ільгот, але не валодаюць працоўнымі навыкамі. Перш за ўсё ў Цэнтры занятасці ім прапаноўваюць атрымаць спецыяльнасць. Навучанне беспрацоўных — адна з асноўных задач гэтых устаноў.

Яны таксама маюць базу даных па вакансіях. На рынку працы прываблліваюць тыя, хто валодае будаўнічымі спецыяльнасцямі, вадзіцелі, электрыкі, фармацэўты, правізары, малодшы медыцынскі персанал. Працоўны рынак перанасычаны такімі спецыялістамі, як эканамісты, юрысты, бухгалтары.

Тэрмін, які звычайна людзі праводзяць у пошуках працы, складае каля 6,5 месяца. За гэты час можна атрымаць кансультацыі па прафарыентацыі, прайсці прафесійнае навучанне ці перанавучанне. Штомесячная грашовая дапамога па беспрацоўі цяпер складае 22 тысячы рублёў.

Апошнім часам папулярнасцю карыстаецца пошук працы праз кадравыя агенцтвы. Як правіла, яны маюць справу з высокакваліфікаваным персаналам. Да прыкладу, база даных кансалтынгавай групы "Тут і зараз" уключае па Мінску 30 000 анкет і павялічваецца ў месяц на 400 кандыдатаў. Большасць тых, хто звяртаецца ў кадравыя агенцтвы, маюць працу, але шукаюць лепшую. Паслугі для суіскальнікаў бясплатныя.

Алена СПАСЮК.

паўпрэды беларусі

У КРАІНЕ ТАНГА І ФУТБОЛА

Наша пасольства ў Аргенціне – першая дыпламатычная ўстанова суверэннай Беларусі ў Лацінскай Амерыцы. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол РБ тут Вадзім Лазерка. Па сумяшчальніцтву ён таксама наш пасол ва Уругваі і Чылі. Дыпламатычны стаж у яго амаль 20 гадоў. Пяць гадоў працаваў у Сакратарыяце ААН у Нью-Йорку. Валодае англійскай, іспанскай, французскай мовамі. Учас нядаўняга прыезду пасла ў Мінск адбылася падрабязная гутарка з Вадзімам Іванавічам.

ДАВЕДВАЕМСЯ АДЗІН ПРА АДНАГО

— Што вас больш за ўсё ўразіла ў час работы на пасадзе пасла ў Аргенціне?

— Уручэнне даверчых грамат ранейшаму Прэзідэнту Аргенціны Дэ ла Руа, — расказвае Вадзім Іванавіч. — Цырымонія іх уручэння мае тут даўнія традыцыі і адна з самых прыгожых. Ганаровы эскорт конных гвардзейцаў у парадных мундзірах суправаджае пасольскую машыну да Ружовага дома (Дом урада). Тут у вельмі ўрачыстай абстаноўцы і ўручаюцца даверчыя граматы. Усё гэта прайшоў і я, паўнамоцны прадстаўнік Беларусі, і, паверце, хвалюючая, з тонкім адценнем мясцовай экзотыкі, у многім нечаканая для нас цырымонія надоўга застаецца ў памяці.

Пасольства Беларусі размешчана ў маляўнічым месцы вельмі прэстыжнага раёна Буэнас-Айрэса. Побач з намі — гандлёвае прадстаўніцтва Расіі, пасольства Балгарыі, карацей, больш за палову акрэдытаваных у Аргенціне пасольстваў. Мы займаем асобны будынак, што дае магчымасць выдзеліць прысутнасць суверэннай Беларусі: вывешаны наш дзяржаўны сцяг, сімволіка, устаноўлена інфармацыйная вітрына з матэрыяламі аб нашай краіне і г.д. Гэта вельмі важна, бо наша пасольства зусім маладое ў параўнанні з іншымі.

Буэнас-Айрэс, што ў перакладзе азначае "спадарожныя вятры", — вялікі мегаполіс, дзе пражывае больш за 12 мільёнаў чалавек: па сутнасці, кожны трэці з усяго насельніцтва краіны. Горад уваходзіць у дзесятку самых населеных і прыгожых сталіц свету. Ні ў адным з гарадоў гэтага кантынента няма такой колькасці музеяў, бібліятэк, універсітэтаў і тэатраў.

Беларускае Пасольства ў Аргенціне было адкрыта ў сакавіку 2000 года. Якраз тады абвастрыўся адзін з наймацнейшых фінансава-эканамічных крызісаў у сучаснай гісторыі краіны. Безумоўна, гэта негатыўна адбілася перш за ўсё на ўзаемным гандлі. І ўсё ж нашаму пасольству ўдалося наладзіць механізм палітычнага ўзаемадзеяння з МЗС, іншымі органамі дзяржаўнага кіравання краіны. Канкрэтны вынік — запрашэнне міністра замежных спраў Беларусі наведаць з афіцыйным візітам Аргенціну.

Пры наладжванні дзелавых адносін, гандлю партнёры хочуць больш даведацца адзін пра аднаго. Гэта датычыць і нашага супрацоўніцтва з Аргенцінай. І тут найважнейшая задача пасольства — хутчэй і шырэй адкрыць Беларусь у краіне знаходжання.

Мы стараемся, — працягвае Вадзім Лазерка, — наладжваць шырокія кантакты. Скарыстоўваем любую магчымасць. Напрыклад, сталі традыцыйнымі прыёмы ў пасольстве 3 ліпеня ў гонар Дня Рэспублікі. Сёлета такі прыём праводзіўся чацвёрты раз. Гасцей было шмат — больш за 250 чалавек, сярод іх прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса з 80 краін свету, акрэдытаваных у Буэнас-Айрэсе. Вядомыя аргенцінскія палітыкі, парламентарыі, грамадскія дзеячы, высокапастаўленыя супрацоўнікі Міністэрства замежных спраў, міжнароднага гандлю і культуры краіны, прадстаўнікі беларускай дыяспары. Аргенцінскае тэлебачанне падрыхтавала і трансліравала тэлерэпартаж аб гэтым прыёме, у які ўвайшлі інтэрв'ю пасла і інтэрв'ю дырэктара Упраўлення Усходняй Еўропы МЗС краіны Э.Масіні.

Вельмі дапамагае ў рабоце тое, што ўсе супрацоўнікі нашага пасольства валодаюць мовай краіны знаходжання — іспанскай. І іх жонкі таксама, прычым ведаюць іспанскую дасканала.

Цікавы момант. Жонка пасла Таццяна Іванаўна вельмі ўдала "адкрыла" аргенцінцам нашу краіну праз беларускую кухню. Яна падрыхтавала для мясцовага тэлебачання паўгадзінную перадачу, прысвечаную нашым вядомым... дранікам. Прычым гэта быў не проста расказ, а цэлая імправізацыя. У пасольстве прадаставілі адпаведнае памяшканне, развесілі ў ім цыбулю, часнок, расклалі бульбу. І паказалі ўсю тэхніку прыгатавання нацыянальнай беларускай стравы: ад абірання бульбы да падачы на стол. А тэлебачанне ўсё гэта зняло і вельмі цікава паказала на ўсю краіну.

— Мы і самі не чакалі, што гэта тэлеперадача атрымае такі вялікі рэзананс, — усміхаецца Вадзім Іванавіч. — Бо тэма зусім не палітычная, а са сферы харчавання, але нам тэлефанавалі ў пасольства і прапаноўвалі падрыхтаваць цыкл тэлеперадач аб беларускай кухні.

ДОБРЫ ПАМОЧНІК – ДЫЯСПАРА

Яшчэ ў пасольстве на самым бачным месцы адкрыты пастаянны "беларускі куток". Тут выстаўлены вырабы нашых мастацкіх промыслаў — з ільну, саломкі, дрэва. Вядома, розныя даведачныя матэрыялы пра Беларусь. Усе, хто наведвае пасольства, маюць магчымасць пазнаёміцца з далёкай для іх краінай.

Побач з Буэнас-Айрэсам размяшчаецца клуб "Усход". 90 працэнтаў яго членаў — выхадцы з Беларусі. Да нас яны адносяцца, падкрэслівае пасол, не тое што лаяльна, а вельмі патрыятычна і добразычліва. Калі клуб праводзіць нейкія мерапрыемствы, то просяць пасольства "пазычыць" на некаторы час гэтыя самыя вырабы беларускіх умельцаў.

У мінулым годзе пасольства

дабрачыннасць

СВЕТ НЕ БЕЗ ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

У пана Хорста Пфістэра з невялікага нямецкага гарадка Клопенбурга, што пад Брэменам, у Беларусі шмат добрых знаёмых, шчырых сяброў - людзей, якія заўсёды з цеплынёй успамінаюць сустрэчы з гэтым энергічным і добразычлівым чалавекам. Ён адзін з тых неабыякавых людзей, хто ўсім сэрцам адгукнуўся на чарнобыльскую трагедыю - лекамі і грашамі пачаў дапамагаць ліквідатарам аварыі, хворым дзецям. І вось ужо амаль 10 гадоў 2-3 разы на год ён прыязджае сюды і ідзе ў сем'і, бальніцы, каб сустрэцца з хворымі, даведацца, чым трэба дапамагчы. Яго добра ведаюць у Рэспубліканскім дзіцячым анкагематалагічным цэнтры, 9-й гарадской клінічнай бальніцы і іншых медыцынскіх установах.

У верасні бягучага года Хорст Пфістэр зноў прыехаў у Беларусь. На гэты раз прывёз доўгачаканыя лекі коштам 1 000 еўра за 6 ампул для хворай на лейкемію дзяўчынкі, дапамог Марыне Патапенка з Магілёва, Таццяне Катэнка з Брэста, Сашу Рудакоўскаму са Слуцка, Ірыне Сільновай з Віцебска, дзецям з Бабруйска, Смаргоні, Пінска, Гродна, Фаніпаля, Мінска — дзецям-інвалідам з малазабяспечаных сем'яў. І гэта пералік маршруту толькі адной вераснёўскай місіі спадара Пфістэра.

Геаграфія яго паездак — не толькі раёны, пацярпелыя ад Чарнобыля. Так здарылася, што, даведаўшыся пра гэтага чалавека, да яго звяртаюцца, як да апошняй інстанцыі ў самых складаных абставінах маці, якія з-за хваробы дзіцяці не маюць магчымасці на дзяржаўную дапамогу купіць дарагія лекі. І звычайна спадар Пфістэр едзе сам, каб высветліць сітуацыю і на месцы вырашыць, чым можна дапамагчы. І гэта не ад недаверу, а ад адказнасці перад тымі, каму ахвяруе.

10 гадоў таму ён заснаваў фонд "Гуманітарная ініцыятыва дапамогі пацярпелым ад чарнобыльскай аварыі". Яго падтрымалі яшчэ некалькі чалавек, якія ўвайшлі ў ініцыятыўную групу. Але здарылася так, што фонд працягвае існаваць толькі дзякуючы энергіі і міласэрнасці пана Пфістэра.

Сардэчная падзяка за дабрыню і спачуванне яму і ўсім, хто хоць аднойчы падтрымаў яго ў гэтай высакароднай і бескарыслівай справе! А гэта вельмі нялёгка (хаця сам спадар Пфістэр не скардзіцца): бачыць сумныя вочы хворых дзяцей, хадзіць па бальніцах, адным словам, сустракацца з бядой. І кожны раз ён вяртаецца з Беларусі ў свой гарадок, каб зноў і зноў вышукваць сродкі. Сярод тых, хто заўсёды дапамагае, настаўнікі і вучні, прадпрымальнікі... 5 000 еўра кожны год збіраюць настаўнікі і вучні школы горада Лоенінгена, асабліва дапамагаюць настаўнікі пан Томан і фрау Дзіркіс, дае сродкі ювелір Фельд, прадпрымальнік Фішэр і шмат іншых людзей, неабыякавых да гора. Пан Пфістэр часта выступае ў школах, у друку з расказамі пра дзяцей з Беларусі, якім патрэбна дапамога.

Пры размове з нашым госцем высветліла, што ў яго добрая сям'я: жонка, чатыры дарослыя сыны-ўрачы і 8 унукаў, і ўсе яны з разуменнем адносяцца да "ношы", якую ён добраахвотна ўзваліў на свае плечы. На маё пытанне, ці не цяжка яму гэтым займацца, пан Пфістэр адказаў, што ў Беларусі вельмі сардэчныя, добразычлівыя і ўдзячныя людзі і ён рады, што можа хоць неяк ім дапамагчы. І яшчэ адзначыў, што рады адчувальным пераменам да лепшага ў Беларусі і спадзяецца, што мы — немцы і беларусы - станем бліжэй адзін аднаму.

НА ЗДЫМКУ: Хорст ПФІСТЭР (у цэнтры) у Рэспубліканскім анкагематалагічным цэнтры.

Таццяна КУВАРЫНА.

арганізавала паездку прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў нашу краіну. Яны самі сабралі грошы і з вялікай цікавасцю адправіліся праз акіян у далёкае падарожжа на сваю этнічную Радзіму. Пабывалі ў Мінску, наведалі тыя мясціны, дзе нарадзіліся і жылі іх продкі, дзе іх карані. Вярнуліся ў захапленні і ў мясцовай прэсе падзяліліся сваімі ўражаннямі аб паездцы, расказалі пра сённяшнюю Беларусь. Цяпер гэты клуб плануе чарговую такую паездку.

ЧЫМ ЦІКАВЫ ГЭТЫ РЫНАК?

У Аргенціны значны аграрны сектар, пад земляробства задзейнічаны дзесяткі мільёнаў гектараў. Аднак узрастанне аб'ёмаў вытворчасці збожжа, як і іншай сельгаспрадукцыі, не суправаджалася адпаведным павелічэннем продажу неабходнай тэхнікі. Прычына — фінансава-эканамічны крызіс, які ахапіў Аргенціну ў апошнія чатыры гады. Цяпер тут эканамічная кан'юнктура палепшылася і можна разлічваць на ажыўленне двухбаковага гандлю — нарошчванне паставак сельскагаспадарчай тэхнікі. Бо Беларусь вырабляе больш як 300 яе відаў.

— Рынак Аргенціны для беларускіх тавараў абсалютна даступны ўсім суб'ектам гаспадарання, якія жадаюць прысутнічаць на ім, — сцвярджае пасол. Мы не назіраем ніякіх абмежаванняў у двухбаковым гандлі, хаця Беларусь пакуль не з'яўляецца, як Аргенціна, членам СГА. Пасольства робіць першыя, але ўпэўненыя крокі для закладкі трывалага падмурка адносін. У самы бліжэйшы час зможам мець канкрэтныя вынікі ў фарміраванні дагаворна-прававой базы супрацоўніцтва. Цяпер практычна гатовы тры важныя пагадненні, якія могуць быць падпісаны ў час візіту міністра замежных спраў Беларусі. Яны закліканы замацаваць нашы двухбаковыя адносіны.

Адкрыліся вельмі нядрэнныя перспектывы для руху сюды нашай кормаўборачнай тэхнікі, трактароў, акрылавых валокнаў, акулярнай оптыкі. Цяпер пасольства актыўна працуе і па іншых групах беларускіх тавараў. Карацей, скарыстоўваючы паляпшэнне эканамічнай кан'юнктуры, пасольства займаецца праблемамі нарошчвання экспарту. Пазітыўныя вынікі чакаюцца ў канцы года.

ПАРТНЁРЫ ПРАПАНУЮЦЬ

— Якія прапановы аб супрацоўніцтве выказваюць дзелавыя колы Аргенціны?

— Аргенцінскія партнёры сталі актыўней звяртацца да нас, — працягвае В.Лазерка. — Мы расцэньваем гэта як вынік той інфармацыйнай работы, якую штодзённа вядзём у краіне знаходжання. І лічым: працаваць неабходна з усімі прапановамі, якія паступаюць у наш адрас. Вядома, прыярытэт аддаём найбольш важным. Канкрэтны прыклад. Цяпер вывучаецца магчымасць прадастаўлення эксклюзіўнага права аргенцінскай спецыялізаванай кампаніі прадстаўляць інтарэсы лідскага завода "Оптык" на аргенцінскім і іншых рынках Лацінскай Амерыкі. Гэта вельмі салідная кампанія, мае шырокія сувязі, добра наладжаны кантакты. Яна ўжо правяла прэзентацыю беларускага прадукту ў Аргенціне і Бразіліі. Ёсць добрыя перспектывы.

Аб'ём нашай размовы не дае магчымасці назваць шматлікія адметнасці Аргенціны. Многія прыродныя мясціны ЮНЕСКА аб'явіла "спадчынай чалавецтва" і ўзяло пад сваю апеку. Пасол спадзяецца, што ў бліжэйшай будучыні гэтыя багацці адкрыюць для сябе беларускія турысты, як і аргенцінскія пазнаёмяцца з маляўнічымі куточкамі нашай краіны. Адна з задач пасольства — дапамагчы гэтым узаемным адкрыццям, каб і тут, у Лацінскай Амерыцы, больш ведалі пра Беларусь.

Міхаіл ШЫМАНСКІ, "Р".

дыпкур'ер

НАЛАДЖВАЕЦЦА СУПРАЦОЎНІЦТВА З АЛЕКСАНДРЫЙСКАЙ БІБЛІЯТЭКАЙ

Адбылася сустрэча Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Арабскай Рэспубліцы Егіпет Сяргея Міхневіча з намеснікам дырэктара Александрыйскай бібліятэкі, паслом Тахерам Халіфа.

У ходзе гутаркі абмяркоўваліся шляхі ўстанаўлення і развіцця ўзаемавыгадных адносін паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і Александрыйскай бібліятэкай. Была дасягнута прынцыповая дамоўленасць аб падпісанні ў пачатку снежня бягучага года Пагаднення паміж дзвюма бібліятэкамі аб супрацоўніцтве ў навуковай і інфармацыйнай галінах. Падпісанне такога дакумента будзе спрыяць пашырэнню навуковых і культурных сувязей паміж Беларуссю і Егіптам.

ДАВЕДКА.

Александрыйская бібліятэка самая буйная ў рэгіёне і ўяўляе сабой арыгінальную архітэктурную канструкцыю, якая займае агульную плошчу 85 405 квадратных метраў. Вышыня будынка бібліятэкі – 33 метры.

Ідэя рэканструкцыі старажытнай бібліятэкі ў Александрыі (пабудавана ў 332 годзе да нашай эры) прапанавана Александрыйскім універсітэтам і ў 1987 годзе падтрымана ЮНЕСКА. Праект рэканструкцыі бібліятэкі рэалізаваны за кошт фінансавых сродкаў шэрагу арабскіх краін, ЕС, ЮНЕСКА, ПРААН, а таксама Егіпта. Кошт праекта складае 225 мільёнаў долараў ЗША.

ПАСОЛ БЕЛАРУСІ СУСТРЭЎСЯ З ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРАМ БАЛГАРЫІ

Адбылася сустрэча Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь Аляксандра Пятрова з прэм'ер-міністрам Рэспублікі Балгарыя Сімяонам Сакскабургоцкім.

У ходзе сустрэчы бакі абмеркавалі стан беларуска-балгарскіх адносін.

А.Пятроў праінфармаваў кіраўніка балгарскага ўрада аб кроках, зробленых для ажыўлення гандлёвых кантактаў з Балгарыяй. У прыватнасці, аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12 "Аб устанаўленні тарыфных прэферэнцый", згодна з якімі Балгарыі тэрмінам на адзін год прадастаўляюцца прэферэнцыі на асобныя групы тавараў у выглядзе паніжэння ставак таможных пошлін на 25 працэнтаў.

Пасол таксама адзначыў, што ў выніку зацікаўленых дзеянняў урадаў дзвюх краін, суб'ектаў гаспадарання ў бягучым годзе назіраецца рост тавараабароту на 146 працэнтаў і беларускага экспарту — на 211 працэнтаў.

Прэс-служба МЗС.

стасункі

ІНСТЫТУТУ ІМЯ ГЁТЭ – 10 ГАДОЎ

Прыхільнікі беларуска-нямецкага грамадска-культурнага ўзаемадзеяння ўрачыста адзначылі дзесяцігоддзе Інстытута імя Гётэ ў Мінску.

Юбілейны вечар адкрыў прамовай Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германіі ў Рэспубліцы Беларусь доктар Гельмут Фрык. Усебаковую дзейнасць інстытута ахарактарызавала цяперашняя яго дырэктар Барбара Фрэнкель-Тонэт. Яна адзначыла, што ў Беларусі ўзрастае цікавасць да нямецкай культуры, ёсць многа жадаючых вывучаць нямецкую мову. Са словам у адказ (на нямецкай мове) выступіў начальнік упраўлення зарубежных сувязей Міністэрства адукацыі Беларусі Уладзімір Ціханаў, які раніцай таго ж дня вярнуўся з Берліна, дзе ўдзельнічаў у канферэнцыі міністраў адукацыі еўрапейскіх краін.

Намеснік дырэктара дэпартамента культуры федэральнага нямецкага ўрада доктар Габрыэле фон Галем паведаміла, што разглядаецца пытанне аб стварэнні ў Германіі Беларускага цэнтра. Доктар Хорст Гарнішфехер, генеральны сакратар усёй сістэмы інстытутаў імя Гётэ ў свеце, назваў найбольш значныя справы сваіх мінскіх калег. Сярод іх — тэатральныя пастаноўкі, выставы, літаратурныя вечары (у тым ліку з удзелам беларускага паэта Алеся Разанава, які часта друкуецца ў Германіі), работа чытальных залаў у Мінску і Віцебску, заняткі па нямецкай мове, якія летась наведвала 1 120 слухачоў.

Да юбілею выдадзены зборнік матэрыялаў "10 гадоў інстытуту імя Гётэ ў Мінску", а таксама спецыяльны нумар часопіса "Мастацтва".

Адам МАЛЬДЗІС.

навінка

Фота БелТА.

"БІЗОН" ПАТРЭБНЫ ЎСІМ

Першая партыя унікальных трэнажораў "Бізон" у хуткім часе будзе выпушчана ў Мінску. Аўтар вынаходства загадчык кафедры біямеханікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі фізічнай культуры Мікалай СОЦКІ (на здымку).

Трэнажор дазваляе дасягнуць высокіх вынікаў у развіцці мышцаў перадплечча, біцэпсаў, трыцэпсаў, пальцаў рук. З яго дапамогай можна выканаць больш як 100 тысяч трэніровачных практыкаванняў і іх камбінацый. Прызначаны "Бізон" у першую чаргу для спартсменаў і людзей, якія праходзяць рэабілітацыю.

вернісаж

"КРАСА АЙЧЫНЫ"





Дух і вялікасць гісторыі нашай краіны дапамагае адчуць выстава "Краса Айчыны", арганізаваная грамадскім аб'яднаннем "Беларуская акадэмія выяўленчага мастацтва", якая прымеркавана да 750-годдзя каранацыі ў Навагрудку заснавальніка і першага князя Вялікага княства Літоўскага Міндоўга.

У экспазіцыі сабраны творы жывапісу, графікі, скульптуры 24 аўтараў. І хаця не ўсе работы тэматычна звязаны з адзначаемай датай, яны злучаны ёю духоўна.

"Краса Айчыны" аб'ядноўвае творы трох пакаленняў мастакоў, якія сфарміравалі сучасную беларускую школу. Сярод майстроў старэйшага пакалення — работы Леаніда Шчамялёва і Гаўрыіла Вашчанкі.

НА ЗДЫМКАХ: мастак Гаўрыіл ВАШЧАНКА; на выставе.

Наталля АБЛАЖЭЙ, БелТА.

асоба

ВЯЛІКІ ЭНЦЫКЛАПЕДЫСТ І ЦУДОЎНЫ ЧАЛАВЕК

5 гадоў таму (14 верасня 1998 года) не стала Якава (Якуба) Якубоўскага.

Смерць яго для ўсіх была незразумелай, нечаканай, бо ён знаходзіўся ў росквіце творчых сіл. Пад яго рэдакцыяй выходзіў часопіс "Байрам. Татары на зямлі Беларусі", розныя газеты, кнігі.

Якуб Адамавіч быў багата адораны маці-прыродай вялікай сілай і магутнай энергіяй, незвычайнай працавітасцю. А найбольш у гісторыю і культуру Беларусі ўвайшоў як энцыклапедыст. Разам са сваім кіраўніком, акадэмікам і народным паэтам Беларусі Петрусём Броўкам Якуб Адамавіч стаяў ля вытокаў нацыянальнага энцыклапедызму, яго развіцця і росквіту, за што ў 1976 годзе разам з іншымі супрацоўнікамі атрымаў высокае і заслужанае званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР.

Немагчыма пералічыць усе энцыклапедычныя выданні, у якіх ён прымаў удзел, але адно, дзе зіхаціла адлюстраваўся яго несумненны талент, мы назавём — гэта папулярная энцыклапедыя "Прырода Беларусі", якая была ўганаравана сярэбраным медалём ЮНЕП — праграмы ААН па навакольным асяроддзі.

Якуб Якубоўскі да канца свайго жыцця вучыўся, меў пяць дыпломаў аб адукацыі і шчодра аддаваў свае веды, ідэі, думкі вучням, прыхільнікам і паслядоўнікам. Ён меў многа сяброў і быў завадатарам шматлікіх культурных акцый.

Разам з тым, сын нашай Беларусі быў не толькі яе адраджэнцам, але і такім жа энтузіястам аднаўлення і ўздыму сваіх супляменнікаў, стаяў ля вытокаў сённяшняга Беларускага грамадскага аб'яднання татар "Зікр ул-Кітаб".

Пяць гадоў прайшло, як не стала Якуба Адамавіча, які пахаваны на Смілавіцкім мізары, але яго энергетыка такая, што і сёння дабратворна працуе на нашу Беларусь!

Ібрагім КАНАПАЦКІ,
кандыдат гістарычных навук.

Міхась МАЛІНОЎСКІ,
правадзейны член геаграфічнага таварыства.

сітуацыя

ЛЫСАЯ ГАРА:

ТАЙНАЙ МЕНЕЙ, ЗАГАДКАЙ БОЛЕЙ

II

Ніл ГІЛЕВІЧ: "ПІСАЎ – ЯК ПІСАЛАСЯ"

– Ніл Сымонавіч, вы афіцыйна прызналіся ў аўтарстве паэмы "Сказ пра Лысую гару". Чаму менавіта зараз?

— Адразу пасля напісання гэтага нельга было рабіць, я думаю, па зразумелых прычынах: рэч настолькі не для дазволенага падцэнзурнага друку, што элементарна было небяспечна. Другая прычына ў тым, што я ведаў: калі паэма будзе жыць як ананімная, яна здабудзе большую вядомасць. Бо калі б з першых дзён ведалі, хто аўтар, то мае многія "сябры" зусім іншую далі б ацэнку. Цытую сябе самога: "Няведанне дапамагло ім сказаць праўду". Даходзіла да кур'ёзнага: у адным і тым жа артыкуле адзін і той жа крытык узахлёб гаворыць пра "Лысую гару", карыстаецца словам "геніяльна" і ў гэтым жа артыкуле піша, што знаходзяцца нейкія няздары, якія свае «Ачмурэнні» (усе ведаюць, што паэма "Ачмурэнне" — мая) хочуць паставіць побач з "Лысай гарой", стаць у адзін шэраг з Ведзьмаком-Лысагорскім. Мне было ад гэтага толькі весела.

У спрэчках пра аўтарства паэмы людзі, якія мяне нібыта добра ведаюць, самі таго не хочучы, адводзілі ад мяне падазрэнне. Той жа Алег Лойка пісаў: "Калі б аўтарам быў Ніл Сымонавіч — я яго ведаю, — ён бы даўно прызнаўся, гэта не той чалавек. Ён бы насіўся і крычаў бы, што гэта я, я!.." Гэта да пытання — як мы адзін аднаго ведаем. А ні чарта не ведаем! З тым жа Лойкам мы знаёмыя больш за паўстагоддзя... Я вельмі замкнуты, самотны чалавек — у сабе. У кампаніі асабліва не хаджу, не лезу...

– Можа паэт і павінен быць такім?

— Можа... Але ж і паэты бываюць розныя. Так, я выступаю з прамовамі, з публікацыямі ў друку, але гэта не тое. Ёсць творчасць. І гэта святая святых для мяне. І пра каханне сваё я нідзе ніколі не казаў. Пра гэта чытайце ў вершах, а ў душу не лезце.



Ніл ГІЛЕВІЧ.

Я і далей не раскрываў бы гэтую таямніцу, але Мікола Аўрамчык, які аказаў мне практычную дапамогу пастаўкай фактаў, дэталяў, які ў медычных пальчатках перадрукоўваў, закладаў у канверты, рассылаў па пошце тэкст — я аддаў яму належнае, — ён пачаў рабіць вельмі дзіўныя для мяне заявы. У апублікаваных у "Полымі" дзённіках Максіма Танка чытаю: "Ах, які малайчына Аўрамчык — такую паэму напісаў — на ўзроўні "Тараса на Парнасе" — хто б мог падумаць!" Былі і іншыя выпадкі.

– Крытыкі і літаратуразнаўцы называлі сярод верагодных аўтараў вас. Некаторыя сцвярджалі: пэўна Гілевіч.

— Мала хто там што думае і гаворыць! Пакуль жывы аўтар сам не прызнаўся, гэта ўсё версіі, здагадкі...

Я не прызнаваўся, бо ананімнасць была толькі на карысць рэчы. Але ў пэўны момант мне ўсё гэта збрыдзела, я адчуў, што трэба ставіць кропку ў гэтай гісторыі. Прайшло 32 гады, як паэма пайшла ў свет. Я ведаю свой цяперашні ўзрост і стан здароўя. І мне не хацелася, каб іншыя людзі зрабілі гэта. Думаю, што не памыліўся, калі прызнаўся сам. Большасць маіх сяброў ухваляюць гэты ўчынак, хаця некаторыя шкадуюць, што тайны больш няма.

– А чаму вы не захацелі, каб усё адбылося, як з "Тарасам на Парнасе", калі даследчык Генадзь Кісялёў толькі вунь калі даказаў, што аўтар – Канстанцін Вераніцын (*пра гэта "ГР" пісала раней.* – **Г.Л.**)***?***

— Такі варыянт нерэальны, бо ў мяне ляжаць чарнавікі. Не стане мяне, будуць глядзець рукапісы...

– Дазвольце агучыць меркаванні апанентаў. Ужо пасля прызнання многія сумняваюцца ў вашым аўтарстве.

— Не думаю, што трэба нешта даказваць. Толькі эстэтычна глухі чалавек, якому слон на вуха наступіў, у якога няма зусім пачуцця мовы, стылю, радка, можа сумняварца, хто гэта напісаў. Усе 30 гадоў я і так здзіўляўся, што шукаюць, прыпісваюць аднаму, другому, пятаму — замест таго каб узяць пачытаць мае кнігі сатыры, мой раман "Родныя дзеці"...

– Вось-вось! Чаму вы не паспрабавалі старанней завуаліраваць Ніла Гілевіча? Як сцвярджаюць многія крытыкі, дастаткова ж пачытаць вашых "Родных дзяцей" і параўнаць з "Лысай гарой"!

— Пытанне вашае для мяне дзіўнаватае. Нашто мне вуаліраваць? Хавацца ад самога сябе? Я пісаў паэму гэтак жа натуральна, як усякі іншы свой твор.

– Значыцца, гэта ваш твор падпісаны іншым імем?

— Канешне! — і толькі. Трэба дзівіцца, што нават мы, пісьменніцкая брацыя, кепска чытаем адзін аднаго. Але не ўсе. Паэт Мікола Чарняўскі прызнаецца, што і раней думаў на мяне, а пасля "Родных дзяцей" усе пытанні адпалі ўвогуле. А тым, хто і цяпер ставіць пад сумненне, я дазваляю абвергнуць тое, што аўтар — я. Баюся, што калі яны возьмуцца гэта даказваць, я заўчасна памру ад смеху!

– Вядзьмак-Лысагорскі нарадзіўся ў 1971 годзе? Альбо той хлопец, які ў 6 класе надрукаваў свае вершы ў "Бярозцы", – гэта малады Францішак Вядзьмак-Лысагорскі?

— Першыя вершы мае былі сатырычныя. На бытавыя тэмы: пра няўдалую суседку-гаспадыню, пра іншае... У мяне паралельна з лірыкай, з паэмамі ад самага пачатку ішла сатыра — усе 50 з гакам гадоў. Таму Вядзьмак павінен быў з'явіцца на свет — і ён з'явіўся.

– Калі ж тады дзень нараджэння Ведзьмака-Лысагорскага?

— 30 верасня 1931 года! (Ніл Сымонавіч называе ўласны. — **Г.Л.**)

– Чаму такі псеўданім?

— Мяне заўсёды трошкі інтрыгавалі, падабаліся падвойныя прозвішчы: Эпімах-Шыпіла, Доўнар-Запольскі... Лысагорскі — натуральна, бо на Лысай гары...

– А чаму Францішак?

— ...шляхетна. І надта ж ужо "наша"! Нацыянальнае, беларускае...

– Усё ж такі Францішак Вядзьмак-Лысагорскі – ваш адбітак, ваш сябар або ваш брат?

— Гэта — я! Вы спыталі б у Купалы: «Янка Купала — гэта вы?», ведаючы пры тым, што ён Луцэвіч?

– Значыцца, для таго каб пісаць "Лысую гару", вам не давялося наклейваць вусы й надзяваць чорныя акуляры?

— Я быў і заставаўся сам сабой. Не стараўся неяк замаскіравацца, падладзіцца пад іншы стыль. Пісаў — як пісалася. Выдумляў у духу сваёй паэтычнай, гратэскавай, сатырычнай фантазіі. Лічу самым моцным раздзел "Вялікі рух" — там самая моцная сатыра.

– Псеўданім стаўся псеўданімам для адной паэмы – паэмы, якая выдавалася шалёнымі накладамі. Але ж "Францішак Вядзьмак-Лысагорскі" – вельмі ўдалы брэнд, імя, на якое стаў рэагаваць народ. І калі б вы працягвалі выдаваць рэчы пад гэтым імем, яны разыходзіліся б стотысячнымі накладамі! Чаму гэтага не адбылося?

— Пасля "Лысай гары" я апублікаваў яшчэ некалькі паэм пад псеўданімамі, і многія да гэтага часу не ведаюць, хто аўтар. Цяпер здзіўляюся, чаму мне не прыйшло ў галаву такое. Думаю, што ў гэтым была воля Божая, боская мудрасць падказала мне: не трэба гэтага рабіць. Што — мала псеўданімаў? У мяне ёсць паэма "Гэй, наперад! Гэй, назад!", якая падпісана "Базыль Раскапэнда-Бабэцкі". Па-мойму, гучыць...

– Псеўданім выбіраўся падчас напісання паэмы?

— Так. Але раней, у першыя пасляваенныя гады, у мяне была кніжачка чэшскага паэта, напісаная на ляшскім дыялекце, Ондры Лысагорскага. Гэта таксама псеўданім. Але выпадковага нічога няма. На маёй роднай Лагойшчыне ёсць Лысая гара — яе доўгі час лічылі найвышэйшай кропкай Беларусі, пакуль на Дзяржыншчыне не знайшлі гару на некалькі метраў вышэйшую. Іншая Лысая гара, не звязаная з гэтай. Так што сам Бог сказаў мне спыніцца на гэтым назове.

– Вам не было крыўдна, калі гэтым псеўданімам пачалі падпісваць многія, не найлепшай якасці ананімныя творы?

— Было непрыемна, што Ведзьмаку прыпісваюць нізкапробныя пісулькі. Але гэта сведчыла, наколькі глыбока пайшла паэма, як яна ўскалыхнула. Гэта даволі рэдкі выпадак, калі падробкі пайшлі касякамі.

– Цяпер у вашай бібліяграфіі з'явілася яшчэ адна кніга, дзе ў дужках будзе пазначана: пад псеўданімам...

— Бясспрэчна! Раскрыюцца і ўсе іншыя псеўданімы.

– Той паход Аўрамчыка у "Крыніцу" быў здзейснены з вашай падачы?

— Я папрасіў яго ўпотай падкінуць туды твор, каб яго апублікавалі ў маёй новай рэдакцыі. Ён ці не справіўся з гэтым заданнем, ці перавыканаў яго, але вырашыў зрабіць інакш. Я ўспрыняў гэта з засмучэннем, таму што ў мяне не было ніякага жадання раскрываць псеўданім. Аўрамчык прадаў таямніцу...

– Але не прадаў вас!

— Але выдаў сябе за аўтара! Вось жа ў чым справа! Ён пачаў усім казаць, што аўтар — ён.

– Што параіце чытачам "Голасу Радзімы"?

— Паэма заканчваецца «Першым...» і «Другім і апошнім папярэджаннем падробшчыкам». Абодва дадаткі заканчваюцца аднолькава: "А чытачам, замест "бывайце",/ Як і раней, я гавару:/ Чытайце, з розумам чытайце/ Мой сказ пра Лысую гару!" Гэткае ж маё пажаданне і чытачам "Голасу Радзімы" — чытайце з розумам — так, як і трэба чытаць літаратуру.

Гутарыў **Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**

P.S. *Звярнуліся мы па каментарый і да Міколы АЎРАМЧЫКА. Ён будзе надрукаваны ў наступным нумары газеты.*

Пачатак у № 39.

КАНТАКТЫ І ДЫЯЛОГІ

ВЕСТКІ МІЖНАРОДНАЙ АСАЦЫЯЦЫІ БЕЛАРУСІСТАЎ. № 17

Беларускія сенсацыі

Рэдкі фотаздымак "белавалосага консула"

Як вядома, першым консулам Расіі ў Японіі быў ураджэнец Беларусі выдатны дыпламат, падарожнік і вучоны Іосіф Гашкевіч. Яму былі прысвечаны Першыя і Другія беларуска-руска-японскія чытанні, якія ладзіліся Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў. Іх матэрыялы выдадзены ў зборніках "Беларусіка-8" і "Беларусіка-25" (апошні выйшаў сёлета).

У абодвух зборніках, кнізе маскоўскага пісьменніка Васілія Гузанава "Белавалосы консул", прысвечанай Гашкевічу, змешчаны фотаздымкі нашага суайчыньніка, але зробленыя пасля яго вяртання на радзіму. Ды аказваецца, што першы яго дагератып быў выкананы яшчэ ў Японіі і што Гашкевіча можна лічыць таксама адным з пачынальнікаў... японскага фотамастацтва. Даведаліся ж мы пра гэта з кнігі, прысвечанай японскай фатаграфіі і прывезенай на Другія чытанні Такада Касіці, грамадскім дзеячам і нашчадкам у сёмым калене Такадая-Кахея, які першым пачаў наладжваць грамадзянскую дыпламатыю паміж Японіяй і Расіяй. У прыватным музеі Касіці-сана ў горадзе Хакадатэ, там, дзе была першая руская дыпламатычная місія, стаіць бюст Гашкевіча, упрыгожаны беларускім ручніком. А хутка, можа, блізка ад музея паўстане і помнік, праект якога зрабіў скульптар Валяр'ян Янушкевіч.

Дык вось, у прывезенай кнізе, як было нядаўна ўстаноўлена з дапамогай супрацоўнікаў Пасольства Японіі ў Беларусі, змешчана рэпрадукцыя першага здымка І. Гашкевіча, зробленага яго вучнем Мацудзабура Йакаяма ў Хакадатэ і паўторанага на нашай ілюстрацыі. Аказваецца, консул сам захапляўся фотасправай і навучыў ёй мясцовага юнака, які займаўся жывапісам. Мацудзабура рабіў малюнкі насякомых з калекцый Гашкевіча, а потым папрасіў яго навучыць фатаграфаванню.

З гадамі Мацудзабура Йакаяма стаў знакамітым фатографам. Яму даверылі рабіць здымкі імператарскіх скарбаў. Ён першы сфатаграфаваў Японію зверху — з паветранага шара. Яго персанальная выстава ў Вене карысталася вялікім поспехам. І, галоўнае, вучань шанаваў памяць свайго настаўніка.

Новыя імёны

Першая навуковая вышыня Ларысы Гедзімін

Беларуская навукова-даследчая школа па старабеларускай літаратуры ўсталявала свае традыцыі параўнальна нядаўна, з 60-х гадоў, пачынаючы з прац А.Коршунава, В.Чамярыцкага, В.Дарашкевіча і інш., калі, праўда, не браць у разлік абагульняльных прац 20-х гадоў XX стагоддзя В.Ластоўскага і М.Гарэцкага. Кожнае новае даследаванне адкрывала для нас забытае імя з кагорты славутых аўтараў нашага красамоўства, уводзіла ў навуковы ўжытак помнік пісьменства ці апісвала значную падзею, з'яву ў літаратурным працэсе. Гэтага патрабаваў час: для наступных пакаленняў даследчыкаў з таямніц кронасу даставаліся імёны нашых дзеячаў славеснасці, чый талент нарэшце будзе адпаведна прыстойна асэнсаваны.

Не так даўно ў беларускай літаратурнай навуцы адбылася па-свойму значная падзея — скрупулёзнаму аналізу падверглася творчасць, здавалася, ужо даволі добра вывучанага аўтара XVII стагоддзя Афанасія Філіповіча. І вельмі ўсцяшае, што гэты аналіз зрабіла малады і таленавіты даследчык Ларыса Гедзімін, якая ўвасабляе новае пакаленне беларускіх вучоных-старажытнікаў, прадстаўленае Іванам Саверчанкам, Аленай Яскевіч, Сяргеем Гараніным, Жаннай Некрашэвіч, Алесем Бразгуновым і інш. Менавіта гэтае пакаленне, як з зайздрасцю адзначаў незадоўга перад смерцю славуты расійскі вучоны акадэмік А.Панчанка, не дазволіць беларусам згубіць сваю гістарычную памяць. І многія гэтыя маладыя вучоныя далучыліся да вывучэння нашай мінуўшчыны на сур'ёзным навуковым узроўні, калі прайшлі вельмі цікавую і ўжо вядомую школу універсітэцкага семінарскага курса Уладзіміра Кароткага.

Сама Ларыса Гедзімін паспела засведчыць сябе выдатным лектарам у нашай вядучай навучальнай установе — БДУ. Яна знаўца не толькі старабеларускай літаратуры, але і цэлага шэрагу сумежных дысцыплін: беларусазнаўства, беларускай культуры, гісторыі беларускай мовы. Што ж датычыцца дысертацыйнага даследавання Ларысы Гедзімін "Творчасць Афанасія Філіповіча ў кантэксце праваслаўнай палемічнай літаратуры канца XVI — першай паловы XVII стагоддзя", паспяхова абароненай у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, то многія яе палажэнні ўжо неаднойчы з'яўляліся на старонках навуковых выданняў.

— Заканчэнне на 6-й стар. —

Прысутнасць беларускай культуры ў свеце

Беларусы — хто ж яны, чаму ж яны такія?

Уважлівы погляд польскага даследчыка

Побач з Яўгенам і Антонам Мірановічамі, Аленай Казлоўскай-Глагоўскай, Алегам Латышонкам, Юрыем Туронкам Рышард Радзік з'яўляецца сёння адным з найбольш вядомых і дасведчаных польскіх беларусістаў у галіне гісторыі і сацыялогіі. Аднак, у адрозненне ад астатніх, ён этнічна не беларус, а паляк. Гэта дазваляе яму быць аб'ектыўным, гаварыць пра нас з пункту гледжання суседзяў.

Імкненне да аб'ектыўнасці — вызначальная рыса першай жа кніжкі Р.Радзіка "Паміж зборнасцю этнічнай і супольнасцю нацыянальнай: Беларусы на фоне нацыянальных змен у Цэнтральна-Усходняй Еўропе XIX стагоддзя". Але асабліва яно характэрна для новай працы вучонага "Хто такія беларусы?", выдадзенай у Торуні ў канцы мінулага года.

Спачатку некалькі слоў пра аўтара кнігі. Р.Радзік — выпускнік факультэта эканомікі Універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне. Потым у Варшаўскім універсітэце вывучаў сацыялогію ў аспірантуры. Кандыдацкая яго дысертацыя прысвечана праблемам фарміравання ўкраінскай, а доктарская (габілітацыйная) — беларускай нацыі. Цяпер працуе ў Інстытуце сацыялогіі сваёй alma mater у Любліне. Р.Радзік з'яўляецца сябрам камітэта ГА "МАБ", удзельнічаў у рабоце II і III Міжнародных кангрэсаў беларусістаў, некалькіх супольных канферэнцыях "Шлях да ўзаемнасці". Даклады на іх таксама змешчаны ў кнізе "Хто такія беларусы?" Але паколькі іх беларускамоўныя версіі ўжо апублікаваны ў зборніках "Беларусіка", іншых кнігах (напрыклад, "Разнастайнасць моў і культур у эпоху глабалізацыі". Мн., 2003), не будзем спыняцца на іх змесце і засяродзім увагу на тым, што мае для беларускага чытача асаблівую цікавасць.

Сутнасць новай працы Р.Радзіка акрэслена ў выдавецкай анатацыі: *"Дадзеная кніжка з'яўляецца спробай адказаць на пытанні: чаму нашы суседзі беларусы так адрозніваюцца ад нас? Аўтар апісвае спецыфіку свядомасці беларусаў – хутчэй, савецкую, а не нацыянальную... Паказвае таксама ўзаемныя польска-беларускія стэрэатыпы апошніх двух стагоддзяў, а таксама ўпершыню апісвае польска-беларускую міжнародную камунікацыю. Часцей адказвае на пытанні: чаму, а не як?"*

Даволі выразным адвображаннем супольнай (у многім усярэдненай) ментальнасці беларускага электарата з'яўляецца першы раздзел кнігі "Прычыны слабасці беларускага нацыятворчага працэсу ў XIX і XX стагоддзях". Аўтар вылучае абагульняючы тэзіс: *"XIX стагоддзе было стагоддзем нацый, аднак беларускі нацыянальны рух узнік толькі на пачатку стагоддзя XX і не знайшоў у царскай Расіі масавай падтрымкі беларускага насельніцтва"* (с.8).

Чаму ж беларусы аказаліся выключэннем з агульнаеўрапейскіх заканамернасцей? Прычын аўтар бачыць некалькі. І галоўнымі сярод іх лічыць тры. Сцісла перакажам іх услед за Р.Радзікам.

Першая заключаецца ў асаблівасцях зместу беларускай народнай культуры. Змест яе быў амаль цалкам сялянскі (як у праваслаўных, так і каталікоў). Прыгонных, а потым і вольных земляробаў не ядналі ідэалагічныя сувязі ("мы — нацыя"), а толькі побытавыя ("мы — тутэйшыя"). Сялянам неставала гістарычнага мыслення (нават у фальклоры). А потым, у савецкі час, гістарычная свядомасць набыла вузка класавы, выбарачны характар, абмяжоўвалася рэвалюцыйнымі падзеямі або падзеямі другой сусветнай вайны. Адмоўна адбілася на працэсе і тое, што народ не адчуваў моўнай супольнасці (літаратуру XIX стагоддзя тварыла пераважна шляхта). Таму і не было ў прастамоўі слоў для выражэння абстрактных паняццяў (у тым ліку і паняцця "нацыя"). Палітыка беларусізацыі ў 20-я гады XX стагоддзя стварыла ўмовы, каб сялянская мова стала мовай нацыі, але потым, у 30-я гады, наступіў адваротны працэс, вынікі якога, паводле Р.Радзіка, адчуваюцца да сённяшняга часу.

Другая прычына — у асаблівасці грамадскай структуры беларускага народа. У XIX стагоддзі ды і пазней яму катастрафічна неставала арыентаванай на будучыню інтэлектуальнай эліты. Гарады і мястэчкі былі руска-польска-яўрэйскімі, шляхта ж глядзела назад, у мінулае, на часы І Рэчы Паспалітай. А сяляне жылі сучаснасцю, адносіліся да эліты варожа, не бачылі ў беларускасці асаблівых перспектыў. На нейкі час такая перспектыва, няхай і "бюракратычная", узнікла ў гады беларусізацыі. Але яна карэнным чынам рознілася ад рускай, польскай ці літоўскай, акрэсленых яшчэ ў XIX стагоддзі (аўтар тут падрабязна характарызуе грамадскія адрозненні).

Трэцяя прычына запаволенасці нацыянальнага развіцця беларусаў (мусіць, унікальнай у Еўропе) — у палітыцы царскай улады. У імкненнях да беларускасці яна бачыла толькі праявы "польскай інтрыгі". Адзінкі (Чачот, Дунін-Марцінкевіч, Каліноўскі) не маглі стварыць нацыянальнай ідэалогіі (першым свядома спрабаваў гэта зрабіць Багушэвіч). Сучасную ідэю беларускай нацыі ўпершыню выклалі пецярбургскія нарадавольцы ў сваім "Гомоне" (1884), але ён застаўся невядомым народу. Таму, паводле Р.Радзіка, нават у "нашаніўскі" перыяд колькасць свядомых беларусаў не перавышала некалькі соцень чалавек, што здаецца заніжаным. Але сітуацыя актывізавалася ў першую сусветную вайну, асабліва ў гады беларусізацыі.

У адрозненне ад разгледжанага раздзела, скіраванага пераважна на мінулае, раздзел "Хто ж такія беларусы?", які даў назву кнізе, прысвечаны сучаснаму грамадству Беларусі. Мэта яго — растлумачыць палякам (першапачатковы тэкст быў надрукаваны ў 1997 годзе ў часопісе "Палітыка Всходня"), у чым іх адметнасць ад усходніх суседзяў. Не асудзіць, як гэта часам робяць іншыя польскія аўтары, а прааналізаваць, стварыць, абапіраючыся пераважна на беларускія публікацыі, па магчымасці аб'ектывізаванае адвображанне.

"У свядомасці палякаў, – гаворыцца ў самым пачатку раздзела, – беларусы з'яўляюцца найменш акрэсленым грамадствам пасярод усіх нашых суседзяў. У Польшчы ўвогуле не ведаюць беларускай гісторыі, культуры, не існуе нават цалкам акрэслены стэрэатып беларуса" (с.79). У польскім друку рэдка з'яўляюцца аналітычныя артыкулы па гэтай праблематыцы. Адсюль — і здзіўленне, неразуменне *"палітычных пазіцый беларусаў, іх адносін да сваёй мовы, гісторыі, нацыянальнай сімволікі, дзяржавы"*.

У раздзеле "Хто такія беларусы?" аналізуюцца таксама рускія ўплывы на беларускае грамадства, праблемы інтэграцыі. Былы Савецкі Саюз беларусы, як і жыхары Усходняй Украіны, звычайна асацыіруюць з Расіяй, а сябе — з усходнім славянствам, а заходнія ўплывы — з нястачай, хаосам і эканамічным махлярствам. Адсюль — недавер да Захаду, каталікоў. Таму *"...у беларускім грамадстве існуюць – абумоўленыя культурай – механізмы, якія блакіруюць як працэсы нацыятворчасці, так і эканамічнай і палітычнай мадэрнізацыі"* (с.93). Таму "беларускасць" пры самахарактарыстыцы асобы звычайна не мае эмацыянальна-патрыятычнага гучання, зводзіцца да "тэрытарыяльнага, рэспубліканскага (постсавецкага) і пашпартнага вымярэнняў". Але гэта, паводле аўтара, не значыць, што Польшчы трэба адвярнуцца ад Беларусі спінай. Польскія ўлады і грамадскія арганізацыі "адназначна павінны ўзмацняць — наколькі гэта магчыма — гаспадарчыя і культурныя сувязі Беларусі з той часткай Еўропы, якая знаходзіцца на захад ад яе", а таксама рэгіянальныя, прыгранічныя кантакты.

Каштоўнасць кнігі Р.Радзіка заключаецца ў тым, што яна тлумачыць не толькі палякам, але часткова і нам, чаму мы такія, якія ёсць. А ці будзем іншымі, залежыць, як піша Радзік, ад саміх беларусаў.

Адам МАЛЬДЗІС.

Новыя імёны

Першая навуковая вышыня Ларысы Гедзімін

Пачатак на 5-й стар.

Асноўная ідэя працы была ў паказе абгрунтавання сувязі творчасці Афанасія Філіповіча з ідэйнай і грамадскай барацьбой, з аднаго боку, і ў раскрыцці шматгранных адносін з багаслоўска-апалагетычнымі і палемічнымі традыцыямі пісьменства праваслаўнай канфесіі, з другога, а таксама вытлумачэнні сутнасці пераемнасці і абнаўлення культурна-мастацкага вопыту мінулых эпох у літаратурным руху барока.

Задача перад дысертанткай стаяла складаная. Напрыклад, пры абароне маёй працы, якая таксама закранала літаратурны працэс гадоў жыцця Афанасія Філіповіча, больш за ўсіх раздавалася закідаў па пытаннях, як, кім і чым акрэсліць наша літаратурнае барока. На гэтыя прадвызначаныя амаль поўнай адсутнасцю сур'ёзных тэарэтычных прац па літаратурнаму барока Беларусі закіды сама Ларыса адказала ў даследаванні сцвярджэннем, што Афанасій Філіповіч ужываў жанры, характэрныя як для заходняй, так і для ўсходняй літаратурнай традыцыі. І менавіта заходняя традыцыя Позняга Сярэдневякоўя — складанага і пераходнага часу да новай культуры і мастацтва — абумовіла з'яўленне ў нашых літаратурных помніках тых рыс, якія ў заходнім мастацтве характарызуюцца як барока. "Дыярыуш" кананізаванага аўтара не з'яўляецца творам чыстага жанру. Гэта кніга, з'яднаная цэльнасцю поглядаў і вобраза аўтара. Ларыса адзначыла, што твор Афанасія Філіповіча "знаходзіцца на мяжы не толькі розных жанравых формаў, але арганічна спалучае ў сабе элементы розных тыпаў творчасці".

У заключэнні дысертацыйнага даследавання Ларыса Гедзімін даволі смела абгрунтоўвае думкі ўдасканалення класіфікацыі палемічнай літаратуры — твораў найбольш разнастайных і пашыраных жанраў старабеларускай літаратуры, а таксама вылучае яе накірункі. Саму асобу Афанасія Філіповіча аўтар прапануе нам зразумець з улікам прынцыпу гістарызму, а такое сцвярджэнне не дазваляе маляваць гэтую славутую постаць выключна адной фарбай. Безумоўна, Філіповіч быў патрыётам свайго краю, жадаў яму найлепшага лёсу, і сам сваёй самаахвярнасцю ў многім прадвызначыў трагізм гістарычных падзей XVII статагоддзя на абшарах Беларусі, калі суровую драму знішчэння найлепшых яе сыноў мы дагэтуль адчуваем на сабе, будзь гэта вайна з Масковіяй 1654–1667 гадоў, Паўночная вайна, падзелы Рэчы Паспалітай з нашым уваходам у Расійскую імперыю, войны за незалежнасць, айчынныя і грамадзянскія войны, часы рэпрэсій... Як хочацца, каб гэтыя з'явы засталіся толькі на паперы ў даследаваннях, прысвечаных нашай мінуўшчыне. А ведаючы мінулае, мы смела можам прагназаваць і ісці далей у будучыню.

Што ж, пажадаем поспехаў нашай маладой беларусістцы Ларысе Гедзімін, яшчэ раз далучымся да віншаванняў з прысуджэннем ёй ганаровай ступені кандыдата навук і будзем чакаць ад яе новых даследаванняў на глебе нашай літаратуры.

НА ЗДЫМКУ: Л.ГЕДЗІМІН ля помніка вялікаму князю літоўскаму Гедыміну ў Вільнюсе. Сваім магчымым продкам можна і ўзганарыцца.

Ігар ВОЙНІЧ,

кандыдат філалагічных навук.

З надасланага

«Литературные вести»

Чэрвеньскі нумар органа Саюза пісьменнікаў Масквы выйшаў пад шапкай "Сумленне Беларусі, сумленне Расіі". Ён цалкам прысвечаны памяці Васіля Быкава.

У нумары змешчаны артыкулы расійскіх пісьменнікаў Юрыя Чарнічэнкі "Узыходжанне", дзе расказваецца аб пахаванні В.Быкава, Валянціна Аскоцкага "Сцяжына, якой не дадзена зарасці", Рыгора Бакланава "Мы ваявалі на адным фронце". Апошні з іх сцвярджае: "Час праходзіць, і я ўсё больш пераконваюся, што напісанае Быкавым застанецца ў гісторыі і беларускай, і рускай літаратуры. Гэта быў пісьменнік з сусветным імем і пры жыцці ўжо класік".

Надрукаваны таксама апошні артыкул В. Быкава "Шлях з цемры", напісаны ў Празе ў сувязі з 80-годдзем рускага палітыка, "дарагога салдата, грамадзяніна і чалавека" Аляксандра Якаўлева, верш Рымы Казаковай "... Заплаканая Беларусь" і артыкул Вольгі Іпатавай "Праўда".

"Прамень"

У сотым нумары газеты латышскіх беларусаў друкуюцца юбілейныя прывітанні.

У іх ліку — сардэчныя словы старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Станіслава Буко, яго латышскага калегі Альгерта Тыпанса, беларусісткі, аўтара кніг пра латышска-беларускія сувязі Ілгі Апіне.

Змяшчаюцца матэрыялы пра першы выпуск Рыжскай беларускай школы. Выпускнікоў павіншавалі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Латвіі Вадзім Ламкоў, дырэктар школы Ганна Іванэ, першы дырэктар мастак і беларусіст Вячаслаў Целеш, старшыня "Саюза грамадскіх аб'яднанняў беларусаў Латвіі" Валянціна Піскунова і іншыя. Пасля ўручэння дыпломаў выхаванцаў школы запрасілі на сустрэчу ў беларускае пасольства. Лепшыя выпускнікі накіраваны ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі.

Друкуецца артыкул пра супрацоўніцтва мастакоў-беларусаў Латвіі і прадстаўнікоў выяўленчага мастацтва Віцебшчыны.

"Czasopis"

Беластоцкі месячнік у дзевятым нумары змяшчае артыкул галоўнага рэдактара Ежага Хмялеўскага "Яны – беларусы", прысвечаны сёлетняму, чацвёртаму трыялогу, які арганізуе ў Крынках вядомы беларускі пісьменнік і беларусіст Сакрат Яновіч.

На абмеркаванне праблем беларусазнаўства сабраліся на Беласточчыне навукоўцы з Англіі, Беларусі, Венгрыі, Германіі, Польшчы. Упершыню патранат над форумам узяў маршалак Падляскага ваяводства Януш Кшыжэўскі. Матэрыялы сустрэчы будуць надрукаваны ў чарговым шматмоўным зборніку "Annus Albaruthenicus" ("Год беларускі").

Валянціна ГРЫШКЕВІЧ.

Пункт гледжання

Ідэалогія нацыянальнага быцця:

дасканалая асоба – гарманічнае грамадства – эфектыўная дзяржава

У апошні час усё большая ўвага ў нашай краіне ўдзяляецца дзяржаўнай ідэалогіі, нацыянальнай ідэі. Ім прысвечаны нарады і канферэнцыі на самых розных узроўнях, навуковыя і публіцыстычныя манаграфіі, зборнікі, артыкулы ў друку. Свой уклад у гэтую праблематыку рашыў унесці вядомы беларускі мовазнавец, аўтар многіх кніг Арнольд Міхневіч, які доўгі час узначальваў Беларускі інстытут праблем культуры.

Найвялікшае багацце ў свеце — чалавек. Толькі ў грамадстве чалавек выяўляе свае прыродныя задаткі і становіцца асобаю. Грамадства здольнае адгукнуцца на запатрабаванні асобы тады, калі яно інстытуцыялізавана ў дзяржаве. Іншага модусу чалавечага быцця не вынайдзена. І таму можна сцвярджаць, што сацыяльны прагрэс грунтуецца на ўзаемасувязі трох феноменаў: асоба — грамадства — дзяржава ў яе часава-гістарычным удасканальванні.

Да такога выраду непазбежна прыводзіць роздум аб тым, што можа легчы ў аснову грамадскай свядомасці як вызначальнага фактару сацыяльнага прагрэсу і яго стрыжня — ідэалогіі як сістэмы поглядаў, канцэпцый, тэорый, на якіх аб'ектыўна грунтуюцца інтарэсы, мэты і перспектывы быцця нацыі.

Трыяда асоба — грамадства — дзяржава служыць канструкцыйным падмуркам ідэалогіі; якасны ж яе змест вызначае ўзаемасувязь тых самых катэгорый, канкрэтызаваных як дасканалая асоба — гарманічнае грамадства — эфектыўная дзяржава.

Асоба — галоўны, свядомы суб'ект руху жыцця. Значымыя рысы асобы ў іх ідэальным уяўленні і патрэбных грамадству практычных выявах — воля, свабода выбару, правы і абавязкі, працавітасць і маральнасць, высокі розум і шматфарбная бясконцасць пачуццяў, знітаванасць з прыродай і дбанне пра будучыню, адкрытасць свету і нацыянальная засяроджанасць, гуманізм і міралюбства, аптымізм і цвярозасць поглядаў, мяккая непахіснасць "быць", а не "ўладарыць", прастадушнасць, а не наіўнасць, любоў і павага да жыцця ва ўсіх яго праявах, вызваленасць ад ілюзій, самазахаплення, ідалапаклонства, прага спазнання і развіццё фантазіі, імкненне не падманваць і ўменне не падманваць, глыбокае самапазнанне і годная самасвядомасць, здароўе і чысціня, сям'я і сябры, музыка і цішыня...

У беларускай нацыі з яе сённяшнім шматнацыянальным існаваннем і воблікам ёсць усе прыродныя і гістарычныя падставы зрабіць дасканалую асобу сваім ідэалагічным арыенцірам. Найперш прыгадаем тут Ефрасінню Полацкую і Францішка Скарыну, Усяслава Чарадзея і Янку Купалу, затым К.Семяновіча і Л.Сапегу, В.Цяпінскага і Я.Намыслоўскага, М.Сматрыцкага і Л.Зізанія, Т.Касцюшку і К.Каліноўскага, І.Гашкевіча і І.Насовіча, У.Сыракомлю і Б. Дыбоўскага, Я.Карскага і У.Караткевіча, Я.Глебава і Р.Шырму, многіх іншых. Яны служылі не толькі свайму грамадству, але і грамадствам суседніх народаў.

Гарманічнае грамадства... Як вядома, грамадства — гэта сукупнасць рознанакіраваных чалавечых узаемадачыненняў, што згуртоўваюць людзей, надаюць ім пэўную цэласнасць. Дачыненні гэтыя маюць сваю арганізацыю, структуру, якая на пэўным этапе развіцця грамадства і вызначае яго эканамічны, палітычны, маёмасны, працоўны, навуковы, гендэрны, кадравы, узроставы, экалагічны, гістарычны, псіхалагічны, адукацыйны, прававы, абарончы, мастацкі, філасофскі, веравызнаўчы і г.д. стан і падзел. Усім гэтым аспектам грамадскай структуры адпавядае тая ці іншая форма грамадскай свядомасці.

Дачыненні, адносіны, стасункі паміж людзьмі прасякнуты супярэчнасцямі, супрацьлегласцямі, барацьба паміж якімі можа служыць руху, развіццю, прагрэсу грамадства, але можа быць і пастаяннай крыніцай варожасці, грамадзянскай напружанасці, нават весці да сацыяльных выбухаў. Сачыць за гэтымі працэсамі, садзейнічаць ім у адных выпадках і прадухіляць іх вынікі — у іншых, аналізаваць і растлумачваць — найважнейшая функцыя ідэалогіі і ідэолагаў.

Жывая плынь грамадскага жыцця складаецца з намераў, задум, ідэй, учынкаў, дзейнасці кожнай асобы ці групы асоб і іх калектыўных паводзін. Грамадства, такім чынам, можа разглядацца як вынік пэўных рашэнняў, што прымаюць асобы ці іх згуртаванні наконт таго, якім яны хочуць бачыць грамадства, з кім і як яны імкнуцца ўзаемадзейнічаць для дасягнення вызначаных мэтаў. Калі мяняюцца мэты, адбываюцца змяненні і ў характары асабістых ці групавых паводзін. Ідэалагічна вызначаць грамадскія мэты — значыць, накіроўваць грамадскі рух. Акрэсліць высакародныя мэты — значыць, прадвызначыць рух грамадства да гарманізацыі адносін паміж людзьмі, указаць кірунак да гарманічнага грамадства.

Паняцце гарманічнага грамадства можа і павінна стаць тым зернем масавай свядомасці, у якім каранятцца, з якога прарастаюць рэальныя адносіны народа і наяўных у яго структуры чалавечых груповак рознага тыпу, фактаў, падзей, з'яў, працэсаў, што закранаюць іх патрэбнасці і інтарэсы. Менавіта грамадска-масавая свядомасць, зарыентаваная на стварэнне гарманічнага грамадства, здольная аналізаваць і ацэньваць, прадпісваць і кантраляваць узоры грамадскіх паводзін, у якіх спалучаюцца рацыянальныя, эмацыянальныя, дзейнасна-валявыя элементы ўчынкаў асобы, групоўкі, малога ці вялікага калектыву, слоя насельніцтва краіны.

Уся ўнутраная структура нацыі, якая імкнецца быць арганізаванай на прынцыпах гарманічнага грамадства, залежыць ад ступені развіцця яе вытворчасці і яе знешніх і ўнутраных зносін. Вытворчасць і зносіны — найгалоўнейшыя фактары, якія вызначылі з'яўленне чалавека на зямлі як радавой істоты. І сёння яны захоўваюць сваё значэнне як чыннікі падтрымкі, замацавання і ўзмацнення чалавечага ў чалавеку, як фактары бесперапыннай і ўзрастаючай сацыялізацыі індывіда. Забеспячэнне вытворчасці і яе ўдасканальванне на падставе плюралізму формаў уласнасці і садзейнічанне расшырэнню знешніх і ўнутраных зносін грамадства — асноўныя задачы дзяржавы. Менавіта дзяржава павінна выступаць гарантам эфектыўнага функцыянавання двух жыццятворных грамадскіх інстытутаў — вытворчасці і зносін, або — іншымі словамі — працы і культуры ва ўсёй разнастайнасці іх рэальных выяў, іх сутнасці, структур і функцый.

Таму пабудова эфектыўнай дзяржавы становіцца адным з найважнейшых складнікаў нацыянальна-дзяржаўнай ідэалагічнай трыяды асоба — грамадства — дзяржава.

Усе кампаненты дзяржавы: сістэма кіравання, школа, праваахоўныя органы, суд і пракуратура, вытворчасць, культурныя ўстановы, армія — найпершай мэтай маюць, у рэшце рэшт, выхаванне асобы і гарманізацыю грамадства. Дзяржава здзяйсняе кіраванне ўсімі сацыяльнымі працэсамі, у рэчышчы якіх і адбываецца фарміраванне дасканалай асобы з яе духоўным светам, культурай мыслення, сілай перакананняў, нацыянальнай самасвядомасцю, адукаванасцю і выхаванасцю, ладам жыцця, маральнымі каштоўнасцямі, міжасабовымі стасункамі, эстэтычнымі схільнасцямі, правамі і абавязкамі, стаўленнем да прыроды, працы і да самой сябе. Ва ўсім гэтым і выяўляецца рэальны гуманізм дзяржавы і яе эфектыўнасць.

Такім чынам, неадменнай асновай ідэалогіі ў яе сучасным, пачатку XXI стагоддзя, тэарэтычным вытлумачэнні служаць паняцці асоба — грамадства — дзяржава. Канкрэтныя сацыяльна-гістарычныя ўмовы могуць запатрабаваць адпаведнай мадыфікацыі гэтай трыяды. Для нас сёння — гэта рэальная асоба — дынамічнае грамадства — суверэнная дзяржава. Але не ў далёкай перспектыве сутнасць ідэалогіі нацыянальна-дзяржаўнага быцця беларусаў будуць вызначаць катэгорыі дасканалая асоба — гарманічнае грамадства — эфектыўная дзяржава.

Арнольд МІХНЕВІЧ,

доктар філалагічных навук, сябра ГА "МАБ", акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі.

гасцёўня

У АЎСТРАЛІЮ — ЗА ЖМЕНЬКАЙ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Палікарп КАВАЛЕЎСКІ з Мінска даўно марыў пабываць у сына, які пераехаў у Паўднёвую Аўстралію ў 1992 годзе і жыве з сям'ёй у Адэлаідзе. Пра сваё падарожжа, далёкі кантынент і яго жыхароў, найперш беларусаў-сваякоў і сяброў сына Віктара Кавалеўскага, ён распавёў нашаму карэспандэнту Рэгіне Гамзовіч.



Гэта цяпер успамінаецца пра тое і гэтае, а тады я не мог наглядзецца на сына, распытваў яго пра ўсё. Астатніх — таксама. Да майго прыезду Віктар задумаў некаторыя работы для мужчынскіх рук, якія мы рабілі разам: трэба было пабудаваць лазню і абабіць дошкамі кухню. Віктар, калі прыехаў у Аўстралію, атрымаў дапамогу ад беларускай абшчыны для пражыцця на першы час — тысячу долараў, а потым атрымаў дапамогу як беспрацоўны, а знайшоўшы работу і зарабіўшы грошай, купіў дом, пабудаваны ў 1912 годзе. Трывалы фундамент з эўкаліпта, але яго падтачылі белыя мурашкі, дык ён перад маім прыездам заліў новы фундамент.

Працуем, а сын расказвае, як жывецца. Потым я з ім ездзіў на працуе ў гэтай сістэме — раздае абеды ў доме для адзінокіх старых. Доўгі час была хатняй гаспадыняй, бо жанчыне работу знайсці цяжка. Старых там паважаюць, клапоцяцца пра іх.

Дарогі ў Аўстраліі добрыя. За 40 кіламетраў ад Адэлаіды жыве мой пляменнік Эдгар. Дарога да яго — у скалах, а зверху пакрыта трывалай сеткай. Пытаюся: нашто гэта? Аказалася, каб камень не зваліўся і не пашкодзіў якую машыну. Калі раптам на такой дарозе адказалі тармазы — панікаваць не трэба, бо на спуску насыпаны пясок, і чым ніжэй, тым больш тармажэнне.

Часам мой сын возіць на сваім аўтобусе беларусаў на адпачынак за горад або туды, куды замовяць аўтобус — гэта яго бізнес. А яшчэ грамадская работа ў яго вялікая, бо ён кіруе з 1999 года Аб'яднаннем беларусаў у Адэлаідзе, піша кніжкі пра гісторыю беларускай эміграцыі ў Аўстраліі, выдае зборнікі вершаў, напісаных беларусамі ў розны час. Клопатаў шмат. Нявестка Іна дапамагае яму як скарбнік. Дзяржава выдзяляе пэўную суму грошай на дзейнасць Аб'яднання, трэба за іх даваць справаздачу.

Звычайна сходы ў іх праходзяць у адным месцы — Банайтан-парку, тут жа адбываюцца святы. Я там быў на святкаванні Дня Незалежнасці. У Аўстраліі ёсць беларуская аўтакефальная царква Пятра і Паўла. Я нават пабываў у гасцях у свяшчэнніка Міхаіла Бурноса і матушкі Вольгі. Быў на Вялікдзень і ў царкве, і ў касцёле.

Шмат дзе пабываў за тры месяцы. Наведаў магілы брата Віктара, яго жонкі Марыі, пабачыў трох пляменнікаў, як яны жывуць. Усе ўладкаваныя добра, дзякуй Богу. У сына тры дачкі, пабываў я ў кожнай унучкі асобна, гасцяваў. Дарослыя дзеці там не жывуць з бацькамі. Праўда, ім бацькі дапамагаюць.

Напрыклад, старэйшая мая ўнучка Аля працуе цырульніцай, мае свой дом, але гаспадарку яшчэ не арганізавала, дык ездзіць да маці па агуркі ды памідорчыкі, перчыкі.

Сын вазіў мяне ў тыя мясціны, дзе жыў і працаваў мой брат Віктар, — на фабрыку цацак, мясакамбінат. Двойчы быў я на яго магіле, маліўся, пасыпаў зямельку, што прывёз, паклаў кветкі. Было мне гэта вельмі прыемна, душа супакоілася. А фатаграфій колькі прывёз, відэакасеты, сынавы кнігі "Беларусы ў Аўстраліі", "Беларусы ў Адэлаідзе". Прачытаў, другім паказваю, ганаруся сынам. Здзейснілася мая мара. Цяпер чакаю — ці вырастуць у мяне аўстралійскія яблыкі, што захоўваюць часцінку той цёплай зямлі, якая сагрэла маіх брата і сына.

НА ЗДЫМКАХ: каталіцкія могілкі Mount Barker. Я прывёз жменьку роднай зямлі на магілу брата Віктара, які пахаваны разам з жонкай Марыяй; у гасцях у айца Міхаіла БУРНОСА (злева направа): айцец Міхаіл, матушка Вольга, я і мая нявестка Іна; Дзень Незалежнасці ў Банайтан-парку ў Адэлаідзе; мы з сынам — ля яго ўласнага аўтобуса.

Аповед **Палікарпа КАВАЛЕЎСКАГА** пераказала **Рэгіна ГАМЗОВІЧ.**

Заканчэнне. Пачатак у №№38, 39.

прэзентацыя

ЗОРУ І ВІТАЎТА КІПЕЛЯЎ УШАНОЎВАЛІ Ў МІНСКУ

26 верасня ў бібліятэцы Дома літаратара ў Мінску адбылася прэзентацыя кнігі Зоры і Вітаўта Кіпеляў "Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе".

Складанне гэтага бібліяграфічнага даведніка пачалося больш за паўстагоддзя таму. На жаль, лёс не дазволіў спадарыні Зоры, грамадскай і культурнай дзяячцы беларускай эміграцыі, літаратуразнаўцу, дачакацца выхаду кнігі. Але ў гэты дзень яна была разам з намі, з беларусамі, з Беларуссю.

У Мінску цяпер выйшла другая частка бібліяграфіі "Асобныя выданні". Тут фіксуюцца 4 180 пазіцый — кнігі, брашуры, адбіткі раздзелаў кніг, адбіткі брашурна-манаграфічнага профілю з часопісаў, дысертацыі, манаграфіі з серыйных выданняў, улёткі, адозвы, статуты, праграмы партый, дакументы і іншыя крыніцы па гісторыі беларускай нацыі.

Варта дадаць, што першая частка бібліяграфіі пад назвай "Перыядычныя выданні" выходзіць у серыйным выданні Нью-Йоркскай публічнай бібліятэкі "Russin, East European and Eurasian Resourse Series (No. 4). Яна ўключае ў сябе беларускамоўныя часопісы, газеты, бюлетэні, а таксама іншамоўныя перыёдыкі, калі да іх выданняў далучаліся беларусы.

На прэзентацыі выступілі гісторык і бібліёграф, грамадскі дзеяч беларускай эміграцыі Вітаўт Кіпель, беларусазнавец Адам Мальдзіс, дыпламат Пётр Краўчанка, пісьменнік Уладзімір Арлоў, паэт Ніл Гілевіч, перакладчык Лявон Баршчэўскі, мовазнавец Зміцер Саўка (менавіта ён і падрыхтаваў кнігу да друку) і старшыня Саюза пісьменнікаў Алесь Пашкевіч.

Прамоўцаў аб'ядноўвала ўсведамленне значнасці выхаду ў свет адной з частак бібліяграфіі "Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе". Дзякуючы намаганням сям'і Кіпеляў, паказана свету значнасць працы некалькіх пакаленняў беларускіх творцаў і выдаўцоў на эміграцыі. Даведнік фіксуе унікальную інфармацыю сведкаў і ўдзельнікаў выдавецкага працэсу беларусаў на эміграцыі на працягу апошняга стагоддзя і крыху ранейшага часу.

У канцы вечарыны стала вядома, што Вітаўт і Зора Кіпелі, а разам з імі і Янка Запруднік ўвайшлі (у чэрвені гэтага года) у Беларускі саюз пісьменнікаў як ганаровыя замежныя сябры.

Міхась ЛЕБЕДЗЬ.

зваротная сувязь

ЗША

"ГОЛАС РАДЗІМЫ" РОБІЦЬ ДОБРУЮ СПРАВУ!

Вялікі вам дзякуй за дасыланне мне "Голасу Радзімы", а гэты "Голас..." мне добра вядомы шмат гадоў — ад часу, як я пасля другой сусветнай вайны апынуўся за мяжой. Здаецца, адразу пасля вайны гэта была "За вяртанне на Радзіму".

...На сёння, трэба аддаць справядлівасць, "Голас Радзімы" робіць вельмі добрую справу, бо падтрымлівае беларушчыну сярод суродзічаў, якія пражываюць у многіх краінах свету. Іншыя весткі, якія той ці іншай дарогай даходзяць да нас з Бацькаўшчыны, сапраўды кашмарныя. Але, нягледзячы на розныя цяжкасці, "Голас Радзімы" робіць карысную работу для пакутнай Беларусі.

Я жадаў бы аплаціць хоць кошт перасылкі газеты, але як гэта зрабіць, не ведаю.

З падзякай за дасыланне газеты і з найлепшымі для ўсіх вас пажаданнямі — быць здаровымі і жыць весела і багата

Віталь КАЖАН.

АД РЭДАКЦЫІ. Удзячныя спадару Віталю Кажану за ўвагу да газеты.

НАГАДВАЕМ,
ШТО АТРЫМАННЕ ГАЗЕТЫ "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА АПЛАЦІЦЬ ЧЭКАМ НА ПРАД'ЯЎНІКА — РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ГОЛАС РАДЗІМЫ», ДАСЛАЎШЫ ЯГО Ў РЭДАКЦЫЮ ПА ПОШЦЕ НА АДРАС: 220005, РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ, МІНСК, ПР. Ф.СКАРЫНЫ, 44.
КОШТ ГАДАВОЙ ПАДПІСКІ "ГОЛАСУ РАДЗІМЫ" Ў ЗША, КАНАДЗЕ, АЎСТРАЛІІ І ІНШЫХ КРАІНАХ ДАЛЁКАГА ЗАМЕЖЖА — 60 ДОЛАРАЎ ЗША, КРАІНАХ ЕЎРОПЫ — 50$.

фестывалі

ТЭАТРЫ РАЗ'ЕХАЛІСЯ, УСПАМІНЫ ЗАСТАЛІСЯ

У верасні ў Брэсце адбыўся тэатральны фестываль "Белая вежа"

Вось ужо восем гадоў запар кожны верасень Брэст ператвараецца ў тэатральную сталіцу. Зараз фестываль "Белая вежа" можна сапраўды назваць міжнародным, бо ў ім прынялі ўдзел калектывы з Абхазіі, Арменіі, Германіі, Італіі, Латвіі, Літвы, Малдовы, Балгарыі, Македоніі, Украіны, Польшчы, Расіі, Ізраіля і, вядома ж, Беларусі. Мельпамена сабрала 17 драматычных і 15 лялечных тэатраў, а галоўнае — вялікую колькасць гледачоў.

Калі параўноўваць сёлетні фестываль з "Вежай-2002", можна вызначыць некалькі новых тэндэнцый: больш актуальнымі сталі тэмы кахання, адносін паміж мужчынай і жанчынай, стан чалавека на вайне, праблема тэрарызму. Рэжысёры па-свойму пераасэнсоўваюць класічныя творы, імкнуцца парушыць стэрэатыпы і знайсці новыя параметры пабудовы спектакля. Як, напрыклад, гэта зрабіла Валянціна Еранькова ў пастаноўцы "Дзівакі" Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя М.Горкага з Мінска ці Ірына Клішчэўская ў незвычайным розыгрышы "Скандал з публікай" кіеўскага калектыву "Кола". "Правал у пейзажы" — гэта музычна-пластычная кампазіцыя Німрадскага тэатра танца (Ізраіль). Па словах рэжысёра Німрада Фрыда, тры яе часткі аб'яднаны тэмай барацьбы і міру, пошукам сярод жорсткай рэальнасці прыгажосці і фантазіі, але існуе і чацвёртая частка дзеі — тое, што адбываецца ў жыцці ў наш час.

Пераможца мінулай "Вежы", рэспубліканскі тэатр "Лучафэрул" з Малдовы, у сваёй "Вестсайдскай гісторыі" паказаў сучасных Рамэо і Джульету, мабыць, таму сярод акцёраў дамінавала моладзь — студэнты Нацыянальнай акадэміі мастацтваў. Сюрпрызам для аматараў сцэнічнага майстэрства сталі таксама пастаноўкі "Пакараць нельга, памілаваць" (Літва), "Клоп" (Беларусь сумесна з Берлінскім тэатрам "Stolitschny"), "Білоксі-блюз" (Латвія). Спецыяльна дзеля такіх спектакляў існуе намінацыя "Лепшы эксперымент". На гэты раз журы вызначыла драму "Ноч Гельвера" магіляўчан.

Лепшымі акцёрамі прызнаны выканаўцы ролей Кармэн і Хасэ — Алія Цеміркаева і Ахтэм Сеітаблаеў. Прыгожыя касцюмы і дэкарацыі, музычна-танцавальныя нумары. Быццам бы ўсё проста. Аднак акцёры размаўлялі на татарскай мове, таму атрымаліся не зусім класічныя вобразы.

Гран-пры "Белай вежы-2003" заваяваў "Махаз" абхазскага калектыву: гісторыя пастуха, які марыў мець сына, але нараджаліся толькі дзяўчынкі. Вельмі пранікнёны, настальгічны спектакль, які глядзеўся на адным дыханні. Яшчэ адна намінацыя "Улюбёнка публікі" — ёю прызнана Яўгенія Белацаркоўская (спектакль "Ноч Гельвера" магіляўчан). Гэта ўсё, што датычыцца драматычных пастановак.

Ужо другі год запар перамагае лялечны тэатр "Патудань" з Расіі. Не так даўно калектыў атрымаў дзве прэміі "Залатой маскі" ў намінацыях "Лепшы спектакль" і "Лепшая праца рэжысёра", а зараз Гран-пры за працу "Неўскі праспект" на "Вежы-2003". Гэта, хутчэй, не фурор, а прафесіяналізм і талент рэжысёра Руслана Кудашова, які стварыў на сцэне цуд. Прыемна, што лепшай актрысай сярод лялечнікаў стала Тамара Тэвасян у казцы "Крысалоў" па творы М.Цвятаевай (Беларусь). У намінацыях "Эксперымент" журы адзначыла спектакль "Святая кніга" (Балгарыя), "Лепшы акцёр", "Улюбёнец публікі" — Андрэй Дзённікаў (за бліскучую ігру ў "Маленькіх трагедыях" тэатра з Масквы).

Дадатковыя дыпломы за дасціпнасць і тэатральнасць атрымалі калектывы з Польшчы і Германіі.

Усё, узнагароды ўручаны, заслона апушчана, калектывы разъехаліся. Але гледачы працягваюць абмяркоўваць незвычайныя спектаклі і шкадаваць, што так і не здолелі набыць білецік на той ці іншы спектакль.

"Белая вежа" — не проста фестываль-спаборніцтва. Гэта шанс для акцёраў "засвяціцца" перад знакамітымі рэжысёрамі, для некаторых першы вопыт удзелу ў мерапрыемствах такога маштабу. Разбураюцца рамкі твораў, межы паміж эстэтыкай і рэальнасцю, змяняецца тэхніка ігры акцёраў, і кідаецца выклік гледачу — гэта тэатр сённяшні, эксперыментальны, камерцыйны. Ці знойдзе ён сваю публіку? Пакуль зразумела толькі, што і ў час інтэрнэта людзі цягнуцца да прыгожага і з задавальненнем знаёмяцца з пастаноўкамі краін — удзельніц Міжнароднага тэатральнага фестывалю "Белая вежа". І гэта нямала для тых, хто аддае свой талент і энергію дзеля апладысментаў у зале.

Ірына ПРЫМАК.

выставы

"БЕЛАРУСЬ. ГІСТАРЫЧНЫЯ ВАНДРОЎКІ"

Выстава дзіцячых малюнкаў пад такой назвай адкрылася ў Мінску ў Траецкім прадмесці ў музеі Максіма Багдановіча. Яна прысвечана 450-годдзю Рэфармацыі на Беларусі і з'яўляецца вынікам рэспубліканскага літаратурна-мастацкага конкурсу, наладжанага гэтым летам міжнародным грамадскім аб'яднаннем "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Больш за 100 малюнкаў дзяцей з розных куточкаў Беларусі адлюстроўваюць іх замілаванасць родным краем, веданне гісторыі краіны, яе культурнай спадчыны. Некаторыя займаюцца маляваннем самастойна, некаторыя — у мастацкіх школах ці студыях, з якіх вылучаюцца клуб "Паходня" з вёскі Бабынічы Полацкага раёна, студыя выяўленчага мастацтва "Вясёлка" горада Вілейкі, студыя "Першацвет" з Мінска.

На выставе прадстаўлены 53 лепшыя работы маладых мастакоў 9-14 год. На жаль, дзеці беларусаў замежжа даслалі свае работы толькі з Расіі і Літвы, нягледзячы на тое, што конкурс быў аб'яўлены ў бюлетэні "Бацькаўшчыны" і на сайце ў Інтэрнэце.

Акрамя малюнкаў, дзеці даслалі свае сачыненні, лепшыя з якіх надрукаваны ў кнізе "Гістарычныя вандроўкі". Выданне стала магчымым дзякуючы Ірэне Калядзе-Смірноў, старшыні дабрачыннага фонду "Ethnic Voice of Amerika" (Парма, ЗША). Ужо трэці год запар выходзяць такія зборнікі і ладзяцца конкурсы, выставы. 162 сачыненні былі дасланы сёлета і разгледжаны Экспертнай камісіяй, якая складалася з вядомых пісьменнікаў і навукоўцаў.

Пераможцы атрымалі гэтым летам цудоўны падарунак — магчымасць адпачыць на курорце ў Чэхіі — зноў-такі дзякуючы клопатам славутай беларускай мецэнаткі з ЗША Ірэне Калядзе-Смірноў.

НА ЗДЫМКАХ: на вокладцы кнігі "Гістарычныя вандроўкі" — малюнак Яўгена МЕЛЬНІКАВА з Вілейскай гімназіі, студыя "Вясёлка". 13 гадоў; "Каранацыя Жыгімонта" — фрагмент з карціны Вікторыі ЛАДЗЯТА з агульнаадукацыйнай школы мастацтваў, Маладзечна. 13 гадоў; 14-гадовая Марына ЯЎСЕЙЧЫК з вёскі Чыркавічы Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці намалявала са слоў відавочцаў царкву, якая раней існавала ў яе вёсцы; "Вежа ў Нясвіжы" — малюнак Дзяніса ЗАХАРЫЧА са Студыі выяўленчага мастацтва Вілейскай гімназіі.

Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

ракурс

ПАКЛОН КНЯГІНІ ІРЫНЕ

Фота БелТА.

Бюст апошняй гомельскай княгіні Ірыны Паскевіч работы маладога скульптара Вячаслава Долгава ўстаноўлены на тэрыторыі сабора Святых Пятра і Паўла ў Гомелі ў парку культуры і адпачынку Гомеля.

Ён увекавечыў памяць вядомай гомельскай мецэнаткі, якая ўнесла вялікі ўклад у развіццё культуры горада. Бюст устаноўлены на сродкі Свята-Петрапаўлаўскага сабора.

знаходкі

СВЕДКІ ДАЛЁКАГА ЧАСУ

У старажытнай частцы Мінска – Верхнім горадзе – на пустыры паміж вуліцамі Герцана і Гандлёвай археолагі, якія вядуць раскопкі ў гэтай частцы Верхняга горада, на глыбіні каля трох метраў знайшлі фрагменты гліняных гаршкоў, у якіх нашы далёкія продкі гатавалі ежу ў другой палове XI – пачатку XII стагоддзя.

Гэта дае падставы меркаваць, што тут калісьці знаходзіўся пасад старажытнага Мінска – заселеная тэрыторыя вакол умацаванай часткі горада, размешчанай у раёне цяперашняй станцыі метро "Няміга".

Дзмітрый ЖАВАРАНКАЎ, "Мінск-Навіны".

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ Ў № 37

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ. 1. Свята. 6. Самота. 8. Прымета. 11. Страта. 12. Адплата. 14. Хата. 16. Луста. 18. Лата. 19. Атрута. 21. Пякота. 22. Турбота. 23. Адзінота. 27. Рэшта. 28. Гармата. 31. Сцірта. 32. Ахвота. 34. Нафта. 35. Арбіта. 36. Гарбата. 37. Сіта. 38. Цырата.

ПА ВЕРТЫКАЛІ. 2. Варта. 3. Жыта. 4. Лета. 5. Распуста. 6. Салата. 7. Мэта. 8. Плата. 9. Лапата. 10. Алегрэта. 13. Галота. 15. Цытата. 17. Маркота. 20. Лянота. 21. Паўната. 24. Дурнота. 25. Чыстата. 26. Ракіта. 29. Акавіта. 30. Помста. 31. Слота. 33. Тата.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82, (тэл./факс).
Галоўны рэдактар: 8029-6-88-17-82. E-mail: golas_radzimy@tut.by

ЧЫТАЙЦЕ «Голас Радзімы» Ў ІНТЭРНЭЦЕ:
http://golas.promedia.by

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж 2 146 экз. Заказ 1518. Падпісана да друку 30. 9. 2003 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе.

Аддрукавана на паліграфічным РУП «Чырвоная зорка» (220073, г. Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3).